

РЫНГ, ПОДЫУМ І ЗВАННЕ «МІС»

ЧЫРВОНКА



КАСМІЧНЫЯ КАПКЕЙКІ ГЛЕБА РУДЗЬКО

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 СТУДЗЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 5 (28872)

**ЛІЧБА ДНЯ**

**1 млн 690 тысяч тон**

*нафты плануе здабыць ВА «Беларуснафта» сёлета, павялічыўшы здабычу на 20 тысяч тон у параўнанні з 2018 годам. Прырост запасаў вуглевадародаў павінен цалкам кампенсаваць здабычу. У апошнія пяць гадоў асноўныя паказчыкі геолагаразведачных работ трымаюцца на стабільна высокім узроўні. Летась у краіне абноўлены шматгадовыя рэкорды праходкі пошукава-разведачнага свідравання, аб'ёмы палявых сейсмаразведачных работ па методыцы 3D. Эфектыўнасць геолагаразведкі таксама імкнецца да максімуму.*



**КОРАТКА**

- **У Беларусі ў 2019 годзе будзе ўведзена 12 тыс. кватэр для шматдзетных сем'яў, што ў 1,7 раза больш за ўзровень мінулага года.**
- Будслаўскі фэст уключаны ЮНЕСКА ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.



- **Беларусы ў 2018 годзе прадалі валюты на $1,1 млрд у эквіваленце больш, чым купілі.**
- Распрацоўкі двух рэзідэнтаў ПВТ увайшлі ў лік самых інавацыйных на выстаўцы ў Лас-Вегасе.
- **У Беларусі працягнулі магчымасць выкарыстання банкаўскіх плацежных картак без чыпа да 2023.**

ISSN 1990 - 763X

# ЛЮДЗЯМ З ВЯЛІКІМІ СЭРЦАМІ

## Прэзідэнт уручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецпрэміі 2018 года



Прэмію «За духоўнае адраджэнне» атрымлівае Юлія БЫКАВА.

Фота БелТА.

**Учора ў Палацы Рэспублікі было святочна — ушаноўвалі лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльнай прэміі дзеячам культуры і мастацтва і прэміі «Беларускі спартыўны Алімп». Перад цырымоніяй уручэння да прысутных звярнуўся кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэты ўрачысты вечар займае асаблівае месца сярод навагодніх свят. Таму што яго героі — нашы суайчыннікі. На яго думку, лаўрэаты прэміі «За духоўнае адраджэнне» — гэта людзі, якіх аб'ядноўвае высакароднае імкненне зрабіць свет больш добрым і прыгожым. Беларускі лідар дадаў, што калі ўдумацца глыбей, то само паняцце «духоўнае адраджэнне» для беларускага народа не проста прыгожая метафара — гэта гімн народнага лёсу.

«Шмат выпрабаванняў выпала на долю нашай роднай зямлі. Але яна заўжды адраджалася і пачынала квітнець яшчэ больш. Стагоддзямі выхоўваўся і гартаваўся наш нацыянальны характар. Мы сталі больш мудрымі, талерантнымі, а самае галоўнае — больш моцнымі ў сваёй веры ў дабрыню», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў: мастацтва, якое нарадзілася на беларускай зямлі, заўсёды мела стваральны характар. Менавіта таму багатая спадчына нашых продкаў і сёння праслаўляе Беларусь. Імёны многіх асветнікаў, дзеячаў культуры, палітыкі і навукі занялі пачэснае месца на старонках сусветнага летапісу.

«І мы ганарымся сваёй гісторыяй і зямлёй — Радзімай славутых людзей, нашых з вамі суайчыннікаў. Ведаем свае карані, ушаноўваем традыцыі. Лёгка прымаем усё новае — галоўнае, каб яно не супярэчыла нашым законам і каштоўнасцям», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, ва ўмовах, калі свет губляе духоўныя арыенціры, мы імкнёмся захаваць унутраную чысціню. І гэта адбываецца не само па сабе, а дзякуючы асабістаму прыкладу і актыўнай дзейнасці цудоўных людзей з велічнымі ідэямі, высакароднымі памкненнямі — людзей шчырых і бескарыслівых у сваіх справах.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што іх праца не вымяраецца лічбамі і эканамічнымі паказчыкамі. Яна не мае цаны і, безумоўна, заслугоўвае прызнання на самым высокім дзяржаўным узроўні, павагі і ўдзячнасці ўсяго народа.

«Сёння мы ўшаноўваем людзей з вялікім сэрцам, якія аддаюць сваю любоў, увагу і цеплыню дзецям з цяжкім лёсам, — дадаў Прэзідэнт. — Узнагароджваем служыцеляў Царквы, якія падарылі Новаму Запавету новае гучанне на беларускай мове. Дзякуем калектывам, якія захоўваюць нашу самабытную культуру. Аўтарам і выканаўцам, якія апяваюць любімы край у сваёй творчасці».

СТАР. 2

Духоўнасць

# «СІМВАЛ БЕЛАРУСІ»

## Перакладчыкі Біблії на родную мову ўшанаваны высокай узнагародай

**Адметна, калі добрыя справы атрымліваюць належную ацэнку не толькі на асабістых «паднябесных» рахунках тых, хто іх робіць: і дзесьці там, за аблокамі, ставіцца «птушачка». Прыемна, калі такія выпадкі адзначаюцца і тут, на нашым зямным узроўні. Бо дабро павінна называцца дабром, а чалавечая праца — атрымліваць належную ўзнагароду. Так, учора, ва ўрачыстай атмасферы, былі ўганараваны лаўрэаты Прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне». Сярод уладальнікаў пачэснай узнагароды — калектывы Біблійнай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы і Секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў каталіцкай царквы камісіі Божага культу і дысцыпліны таінстваў пры Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў у Беларусі. Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з протаіерэем Сергіем ГАРДУНОМ. Ён з'яўляецца старшынёй рабочай групы і адказным рэдактарам перакладу, які зроблены праваслаўнай царквой. Варта адзначыць, што разам з ім над тэкстам стала працавала яшчэ пяць чалавек. Гэта прафесар, доктар філалагічных навук Іван Чарота, протаіерэй, выпускнік філалагічнага факультэта БДУ і духоўнай семінарыі Аляксандр Пачопка, кандыдат філалагічных навук, фалькларыст Уладзімір Васілевіч, выпускнік філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат багасloўя Алесь Кароль, а таксама Таццяна Матрунчык, якая з'яўлялася выканаўчым сакратаром.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**— Айцец Сергій, раскажыце, ці думалі, што ваша праца атрымае такую высокую ўзнагароду? Якія першыя ўражанні?**

— Вядома, такой узнагароды мы не чакалі. Яна вельмі радуе. Прыемна, што на такія рэчы, як пераклад Біблії на родную мову, наша грамадства і ўлады звяртаюць увагу і цэняць іх. Чаму гэта так важна для мяне асабіста?.. Я вырас у той час, калі за наведванне храма, хрышчэнне, вянчанне звальнялі з работы. Евангелле было пад забаронай. Хоць за мяжу выязджалі рэдка, але калі ехалі, Свяшчэннае Пісанне канфіскоўвалі. Гэта кніга дзесьці была, але ў вельмі абмежаванай колькасці. Цяпер мы жывём у краіне, дзе зусім іншае стаўленне да царквы, да Біблії. Яна прызнаецца самай важнай і галоўнай кнігай, прычым для ўсяго чалавецтва. Гэта радасна і прыемна.

Сама ідэя прэміі «За духоўнае адраджэнне» мне таксама падабаецца. Думаецца, яна мае глыбокі сэнс і нібы сапраўды закладае праграму такога адраджэння. Нават назва ўказвае на яго важнасць і значнасць. Безумоўна, гэты працэс для нас, хто мае духоўную традыцыю, звязаны і з Бібліяй. Калі мы цэнім новыя пераклады, мы спадзяемся, што яны будуць больш чытацца, пашырацца, што мы наблізімся да сваіх вытокаў. Будзем адчуваць сваю роднаснасць з Кірылам Тураўскім, Ефрасінняй Полацкай, прападобнамучанікам Афанасіем, Францыскам Скарынам. Яны жылі ў хрысціянскай традыцыі і заклалі падмурак нашай культуры, духоўнасці. Важна, каб мы не толькі памяталі імёны, але і набліжаліся да іх духоўнасці. Пераклады гэтаму спрыяюць, і сама прэмія спрыяе духоўнаму адраджэнню.

**— Ці было складана зрабіць такі пераклад?**

— Складана. Аднак усведамленне таго, што гэта патрэбна, урэшце прывяло да выніку. У 1989 годзе дазволілі адкрыць духоўную семінарыю ў Жыровічах, мы адчулі свабоду для рэлігійнага жыцця.

СТАР. 13

# ЛЮДЗЯМ З ВЯЛІКІМІ СЭРЦАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах кіраўніка дзяржавы, у гэты вечар адзначаюць усіх таленавітых дзеячаў культуры, чые праекты былі прызнаныя найлепшымі. Уручаюць прэмію «Беларускі спартыўны Алімп» моцным духам, валявым людзям, якія прысвяцілі сваё жыццё высокім дасягненням айчыннага спорту. Аддаюць даніну захаплення беларускім жанчынам, іх прыгажосці і духоўнасці, якія заслужылі сусветнае прызнанне.

«Мы заўсёды будзем беражліва ставіцца да сваіх культурных здабыткаў. Але галоўная каштоўнасць дзяржавы — гэта вы, нашы людзі, якія сваім талентам, творчасцю, працавітасцю прымнажаюць яе славу, натхняюць суайчыннікаў на добрыя справы, з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Пасля цырымоніі ўручэння дыпломаў і нагрудных знакаў некаторыя з узнагароджаных выступілі са словамі падзякі, а завяршыў усё святочны канцэрт майстроў мастацтваў «Раство. Радзіма. Адраджэнне». Адзін з нумароў лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» спявачка Юлія Быкава выканала разам з малодшым сынам Прэзідэнта Мікалаем.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Эканоміка адукацыі

# Цяпер і для дашкольных установ...

**У 2019 годзе ўрад запускае пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання дзяржаўных устаноў дашкольнай адукацыі. Ён накіраваны на ўдасканаленне бюджэтнага фінансавання ў галіне адукацыі. Сутнасць новай схемы — фінансаванне дзіцячых садкоў будзе «прывязвацца» да колькасці выхаванцаў.**

Пілотны праект ахопіць дзяржаўныя ўстановы дашкольнай адукацыі, якія функцыянуюць на тэрыторыі Баранавіч, Віцебска, Гомеля, Магілёва, Лідскага, Слонімскага і Салігорскага раёнаў, а таксама ў Першамайскім раёне сталіцы.

Пастановай вызначаны базавы нарматыў для выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі, размешчаных у гарадах, пасёлках гарадскога тыпу, у памеры 1943,65 рубля ў год, у сельскіх населеных пунктах — у памеры 2423,08 рубля ў год, і карэктуючыя каэфіцыенты, якія прымяняюцца да базавага нарматыву. У прыватнасці, каэфіцыент залежыць ад тыпу групы, якую наведвае выхаванец (санаторная, спецыяльная, група інтэграванага навучання і выхавання, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі), ад колькасці выхаванцаў (для дашкольных устаноў з рознай напаўняльнасцю прымяняюцца розныя карэктуючыя каэфіцыенты). Каэфіцыенты залежаць таксама і ад працягласці знаходжання дзяцей ва ўстанове дашкольнай адукацыі (гэта можа быць 10,5, 12 ці 24 гадзіны або група кароткатэрміновага знаходжання). Пад увагу бярэцца і магчымасць наведвання ў дашкольнай установе басейна.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права павялічваць аб'ём бюджэтных сродкаў пры наяўнасці крыніц пакрыцця такіх выдаткаў.

Міністэрству адукацыі даручана да 1 лютага 2020 года прадставіць у Савет Міністраў справаздачу аб выніках рэалізацыі пілотнага праекта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Дзяржаўны інтарэс

# Сіноптыкі не робяць надвор'е,

## а вымяраюць яго

**Нядаўна ў беларускай сталіцы адбылося адкрыццё новага комплексу метэаралагічных і аэралагічных назіранняў «Мінск». Урачыстае мерапрыемства прайшло з удзелам намесніка прэм'ер-міністра Міхаіла РУСАГА і міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя ХУДЫКА.**



— Кіраўніком дзяржавы было жорстка пастаўлена пытанне аб тым, што метэаралагічны сектар павінен быць мадэрнізаваны ў самыя кароткія тэрміны. Была складзена дарожная карта да 2020 года, — сказаў Міхаіл Русы падчас адкрыцця комплексу. Ён дадаў, што дзякуючы такой мадэрнізацыі пашырыцца супрацоўніцтва з інтэрнэт-рэсурсамі (дакладная метэаралагічная інфармацыя павінна быць ва ўсеагульным доступе) і з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях (для своечасовага папярэджання насельніцтва падчас аранжавага ці чырвонага ўзроўню небяспекі).

Будаўніцтва новага пункта метэаралагічных і аэралагічных назіранняў у Мінску пачалося ў красавіку мінулага года, а ўжо 5 лістапада быў уведзены ў строй першы пускавы комплекс. Сучасны комплекс у Мінску будзе перадаваць інфармацыю ў анлайн-рэжыме восем разоў на суткі па 12 параметрах.

— Тое, што неабходна палепшыць прагназаванне надвор'я, у нашым грамадстве абмяркоўваецца даўно. Ад кіраўніка дзяржавы паступіла даручэнне палепшыць работу Белгідрамета. Былі выдзелены сродкі на гэтыя мэты. Многае ўжо зроблена ў плане тэхнічнай мадэрнізацыі, прагнозы сталі больш дакладнымі. Мы дасягнулі па абласцях дакладнасці прагнозаў 97—98 %, па абласных цэнтрах — 93—95 %. З кожным годам, укладваючы інвестыцыі, прыцягваючы новыя тэхналогіі, навучаючы спецыялістаў, мы будзем набліжацца да найлепшых паказчыкаў. Наша работа накіравана на максімальны вынік, — падкрэсліў Андрэй Худык.

Увод у эксплуатацыю метэаралагічнага комплексу ў сталіцы дазволіць забяспечыць поўны цыкл гідраметэаралагічных назіранняў (прыземных метэаралагічных, аэралагічных, актынаметрычных, гідралагічных, радыяметрычных) з дапамогай сучаснага высокапрадукцыйнага абсталявання.

Унікальнасць новага комплексу заключаецца ў тым, што тут упершыню ўкаранёны інтэграваны падыход функцыянавання розных сетак назіранняў. Для ажыццяўлення ўсіх відаў назіранняў закуплены і ўстаноўлены самыя сучасныя прыборы і абсталяванне.

Прыземныя (раней было неабходна будаваць вышкі, зараз усю інфармацыю можна атрымліваць з ніжняга пункта) метэаралагічныя назіранні праводзяцца кругласутачна з дапамогай аўтаматызаванай інфармацыйнай вымяральнай сістэмы вытворчасці беларускай кампаніі ААТ «Пеленг», у склад якой уваходзіць 25 датчыкаў, і ўключаюць назіранні за станам, змяненнем і развіццём атмасферных працэсаў, у тым ліку за неспрыяльнымі і небяспечнымі гідраметэаралагічнымі з'явамі, вымярэнне параметраў і вызначэнне метэаралагічных характарыстык (74 параметры і характарыстыкі).

На тэрыторыі комплексу ўведзены ў эксплуатацыю адзіны ў Беларусі тэмпературна-ветравы прафілямер у мабільнай версіі. Выкарыстанне такога роду абсталявання дазволіць у рэжыме рэальнага часу ажыццяўляць бесперапынны маніторынг параметраў ветру і тэмпературы ў ніжніх пластах атмасферы для прагназавання небяспечных метэаралагічных з'яў, правядзення радыяцыйна-экалагічнага маніторынгу ў Мінску і на тэрыторыі Беларускай АЭС для разліку распаўсюджвання забруджвання, калі раптам узнікне нештатная сітуацыя.

На сённяшні дзень у Белгідрамета ёсць у распараджэнні тры радыёлакатары: у Мінску, Гомелі і Брэсце. Плануецца забяспечыць адпаведным абсталяваннем Віцебск і Гродна, а таксама замяніць радыёлакатар у Брэсце. Работы па мантажу радыёлакатара ў Віцебску будуць скончаныя ў снежні 2018 года, у Гродне праводзяцца работы па выбары зямельнага ўчастка для размяшчэння радыёлакатара.

Сетка стацыянарных пунктаў назіранняў Белгідрамета не цалкам пакрывае тэрыторыю краіны, асабліва ў частцы назіранняў за ападкамі. У цяперашні час у Беларусі метэаралагічная сетка складаецца з 51 пункта назіранняў, на 38 з іх устаноўлены аўтаматызаваныя метэаралагічныя сістэмы. Да 2020 года плануецца павелічэнне сеткі метэаралагічных назіранняў да 60 пунктаў.

**Вольга ПРАЛЮК.**
**Фота аўтара.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Столтэнберг: у бягучай сусветнай абстаноўцы неабходна павелічэнне выдаткаў на абарону краін НАТА

Узмацненне кааперацыі ў рамках НАТА і давядзенне ваенных выдаткаў краін — членаў альянсу да 2 % ВУП неабходна ва ўмовах, калі нявызначанасць у свеце расце. Пра гэта паведаміў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг, выступаючы на штогадовым пасяджэнні Канфедэрацыі нарвежскіх прадпрыемстваў.

«Дамовы скасоўваюцца, узводзяцца мытныя сцены, міжнародныя дамовы знаходзяцца пад ціскам», — прыводзіць яго словы Нарвежскае тэлеграфнае бюро. Ён адзначыў у ліку іншага, што «Расія на працягу многіх гадоў парушала Дагавор аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці», што, на яго думку, «можа прывесці да пагрозы разбурэння сістэмы пагадненняў аб забароне ядзерных узбраенняў».

«Мяне здзіўляе, як мала ўвагі гэтаму аддаецца», — дадаў Столтэнберг. Для таго, каб справіцца з няпэўнасцю сітуацыі, якая зараз існуе, мяркуе генеральны сакратар, трэба садзейнічаць трансатлантычнаму супрацоўніцтву. Ён адзначыў, што пытанне павышэння ваенных выдаткаў асабліва актуальнае, бо многія краіны, у першую чаргу ЗША, лічаць несправядлівым іх размеркаванне ў рамках НАТА.

## У Нарвегіі невядомыя выкралі жонку мільянера і патрабуюць выкуп у крыптавалюце

Зламыснікі скралі жонку нарвежскага інвестара Тома Хагена 31 кастрычніка 2018 года і запатрабавалі выкуп у памеры €9 млн. Як паведаміў журналістам прадстаўнік паліцыі Нарвегіі Томі Броске, праваахоўнікі ўвесь гэты час праводзілі расследаванне і вырашылі раскрыць інфармацыю толькі цяпер.

«Публікацыя гэтай інфармацыі была складаным рашэннем. Мы лічым, што абнародаванне факта выкрадання можа дапамагчы здабыць каштоўную інфармацыю для далейшых дзеянняў», — заявіў Броске.

68-гадовая Ганнэ-Элізабет Хаген знікла са свайго дома ў камуне Лёрэнскуг побач з Осла дзесяць тыдняў таму. Паліцыя з самага пачатку разглядала версію выкрадання. Улады пацвердзілі, што злачынцы патрабуюць выкуп у крыптавалюце. Праваахоўнікам удалося ўстанавіць кароткатэрміновы кантакт са злачынцамі. Выкрадальнікі пагражалі расправай над жанчынай у выпадку невыканання умоў.

Паліцыя апытала сведак. Сям'я Хаген заявіла пра нежаданне кантактаваць з прадстаўнікамі СМІ.

## Японія чакае ад ЗША падтрымкі ў пытанні аб мірным дагаворы з Расіяй



Прэм'ер-міністр Японіі Сіндза Абэ разлічвае, што ЗША падтрымаюць яго намаганні па заключэнні мірнага дагавора з Расіяй у якасці сродку па стрымліванні Кітая. Пра гэта, як паведаміла ў сераду агенцтва Kyodo, заявіў спецыяльны саветнік кіраўніка японскага ўрада Кацуюкі Кава ў Гудзонаўскім інстытуце ў Вашынгтоне.

Хацелася б, каб ЗША зразумелі важнасць заключэння японa-расійскага мірнага дагавора ў якасці сродку сумеснага процідзеяння пагрозе з боку Кітая, — прыводзіць агенцтва яго словы. — Прэм'ер-міністр Абэ рашуча настроены на падпісанне гэтага дакумента і вырашэнне тэрытарыяльнай спрэчкі з Расіяй падчас свайго знаходжання на пасадзе кіраўніка ўрада.

Абэ, як чакаецца, наведае Расію ў другой палове студзеня. Перад гэтым 14 студзеня кансультацыі ў Маскве для падрыхтоўкі яго візіту правядзе кіраўнік японскага МЗС Тара Кона.

# СПАРТЫЎНЫ «ОСКАР»

## Названы найлепшыя лёгкаатлеты краіны

**Прэмія «Атлетыка» стала традыцыйнай, вось ужо пяць гадоў запар у пачатку года Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі вызначае найлепшых спартсменаў і трэнераў мінулага года, узнагароджваючы іх вытанчанымі бронзавымі статуэткамі.**

З году ў год цырымонія ўручэння прэміі становіцца ўсё больш маштабнай, а ўзяць запаветную статуэтку для спартсменаў становіцца ўсё больш прэстыжна. *«Калі мы пачыналі, было вельмі шмат скептычных каментарыяў: «Навошта? Можна было б накіраваць сілы і сродкі на нейкія іншыя пачынанні!» Але сёння відавочна: «Атлетыка» апраўдала сябе на ўсе 100 працэнтаў,* — заўважае **кіраўнік Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.** — *Дастаткова паслухаць каментары спартсменаў, якія адзначаюць: заваяванне гэтай статуэткі стала для іх важным стымулам.*



Найлепшая лёгкаатлетка краіны Вольга МАЗУРОНАК.

*Унутраную канкурэнцыю ніхто не адмяняў. Асабліва, калі гаворка не пра нейкія ўнутраныя разборкі ў сектары або на дарожках, а пра публічнае прызнанне».*

Сёлета мерапрыемства ператварылася ў сапраўдны баль. Атлеты, якіх мы звычайна прывыклі бачыць у спартыўным адзенні на бегавых дарожках і ў лёгкаатлетычных сектарах, пераапрануліся ў бальныя сукенкі і смокінгі. Тут сабраліся не толькі самі спартсмены, але і ўся лёгкаатлетычная сям'я — трэнеры, суддзі, людзі, якія ўжо завяршылі сваю спаборніцкую кар'еру, але ўнеслі вялікі ўклад у развіццё гэтага віду спорту. Прысутныя яшчэ раз падвялі вынікі 2018 года і ўспомнілі яго самыя яркія моманты. Дарэчы, летась нашыя лёгкаатлеты ўстанавілі 27 нацыянальных рэкордаў і завявалі на міжнародных спаборніцтвах медалі ўсіх якасцяў, так што ўспомніць сапраўды было што.



Найлепшы лёгкаатлет краіны Максім НЕДАСЕКАЎ.

Традыцыйна спецыяльная ўзнагарода ўручаецца ў чатырох узроставых катэгорыях: «Юнакі», «Юніёры», «Моладзь» і «Дарослыя». Найлепшай спартсменкай краіны па выніках 2018 года прызнана Вольга Мазуронак. Нагадаем, беларуска выйграла чэмпіянат Еўропы на марафонскай дыстанцыі. Увесь свет абляцелі здымкі, як у Берліне Вольга змагалася не толькі з пякучым сонцам, але і з насавым крывацёкам. Адзначым, што Мазуронак з'яўляецца рэкардсменкай краіны ў марафоне і паўмарафоне.

Сярод мужчын найлепшым лёгкаатлетам былі названы скакун у вышыню Максім Недасекаў, які заваяваў сярэбраны медаль на чэмпіянаце Еўропы. Дарэчы, Максім адзіны спартсмен за пяць гадоў, якому на адной цырымоніі ўдалося ўзяць адразу дзве ўзнагароды. Ён жа стаў найлепшым сярод хлопцаў у катэгорыі «Моладзь».

У гэтай жа катэгорыі сярод дзяўчат статуэтку атрымала Эльвіра Герман, маладая бягунья выйграла залаты медаль дарослага чэмпіянату Еўропы ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі.

У катэгорыі «Юніёры» сярод дзяўчат перамогу святкавала Карына Таранда — чэмпіёнка свету (U-20) па скачках у вышыню, фіналістка чэмпіянату Еўропы, пераможца чэмпіянатаў і кубкаў Беларусі, рэкардсменка краіны сярод юніёраў.

Найлепшым спартсменам у гэтай узроставай катэгорыі прызнаны сярэбраны прызёр юніёрскага чэмпіянату свету, рэкардсмен Беларусі (U-20) — Яўген Багуцкі (кіданне дыска).

У катэгорыі «Юнакі» пераможцамі сталі Лізавета Дорц (штурханне ядра) і Аляксей Александровіч (штурханне ядра).

Найлепшай камандай года прызнана жаночая каманда ў марафоне ў складзе Вольгі Мазуронак, Марыны Даманцэвіч, Настассі Івановай і Ніны Савінай.

*Пераможцы ў іншых намінацыях:*

*«Прарыў года» — Дзмітрый Набокаў (скачкі ў вышыню);*

*«Адкрыццё года» — Віталь Жук (мнагабор'е);*

*«Учынак года» — Аліна Талай (бег з бар'ерамі);*

*«Характар года» — Вольга Мазуронак (марафон).*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ЯКІЯ ХВАРОБЫ НЕ ДАЗВОЛЯЦЬ СЕСЦІ ЗА РУЛЬ?

**Месяц таму Міністэрства аховы здароўя прыняло пастанову № 88. Яна рэгламентуе пералік хвароб, якія перашкаджаюць кіраванню транспартнымі сродкамі. Аб тым, што ж змянілася ў гэтай сферы, расказвае кансультант упраўлення медыцынскай экспертызы галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Ірына БОЛДЫРАВА.**

— Усе навацыі датычацца толькі катэгорыі В. Галоўная з іх — адзіны падыход у допуску да кіравання. Знік падзел на катэгорыі з правам найму на работу і без яго.

Змяніліся і тэрміны абавязковага пераагляду кіроўцаў. Напрыклад, у чалавека здарыўся інфаркт міякарда. Раней ён мусіў з'яўляцца пасля гэтага на паўторную медкамісію сама меней праз год з паўторным аглядам праз дванаццаць месяцаў. Зараз часавы цэнз зменшыўся да шасці «стартавых месяцаў». Акрамя таго, штогадовы пераагляд распаўсюджваецца толькі на першыя два гады пасля дыягностыкі гэтай хваробы. Далей тэрмін павялічаны да двух гадоў.

Зменшыўся і пералік медыцынскіх супрацьпаказанняў да кіравання. Напрыклад, жанчыны з тэрмінам цяжарнасці больш за трыццаць тыдняў за руль садзіцца права на мелі. Цяпер жа гэтае абмежаванне знятае.

Стане прасцей і інвалідам з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату. Яны здолеюць уладкоўвацца кіроўцамі, напрыклад, у таксі. Гэта датычыцца і тых, хто мае групу па слыху. І гэта яшчэ не ўсё. Напрыклад, кіроўца з двухбаковай глухатой праходзіў пераагляд раз на два гады. Цяпер жа — кожныя пяць.

А вось парадак агляду кіроўцаў застаўся ранейшым. Як і падыход да іншых катэгорый, акрамя В.

Праект пастановы распрацоўваўся пры ўдзеле галоўных штатных і пазаштатных спецыялістаў Міністэрства аховы здароўя. На ўзбраенне браліся нарматыўна-прававыя акты ў галіне аховы здароўя, арганізацыі дарожнага руху. Улічваліся і практычны досвед ранейшых пастаноў, клінічныя пратаколы абследаванняў і новыя метады лячэння.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Актуальна

# ГРЫП ПАКУЛЬ ДАЛЁКА?

## У Беларусі выяўляюцца адзінкавыя яго выпадкі, а ў Грузіі і Украіне тым часам ёсць памерлыя ад ускладненняў

**Узровень захваральнасці вострымі рэспіраторнымі захворваннямі і вірусам грыпу ў краіне застаецца на нізкім узроўні. Рэгіструюцца адзінкавыя спарадычныя выпадкі грыпу.**

— Апошнім часам у жыхароў Беларусі штогод рэгіструецца каля 2 мільёнаў эпізодаў вострых рэспіраторных інфекцый. З іх тры чвэрці выпадкаў — звычайныя прастуды ці вострыя рэспіраторныя інфекцыі, — расказала **загадчык аддзела пульманалогіі і хірургічных метадаў лячэння хвароб органаў дыхання РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Алена ДАВІДОЎСКАЯ.** — Прычым, трэць усіх выпадкаў здараецца менавіта ў зімовы перыяд.

Яна адзначыла, што ў беларусаў штогод рэгіструецца да 50 тысяч выпадкаў пнеўманій, і трэць з іх — таксама ў зімова-веснавы перыяд. Прычына ўзнікнення гэтага бактэрыяльнага ўскладнення — як правіла, вострая рэспіраторная інфекцыя.

— Перыяд з пачатку студзеня і да сакавіка, нават да красавіка традыцыйна лічыцца часам пад'ёму захваральнасці на вострыя рэспіраторныя захворванні і грып. Сёлета пакуль іх узровень нізкі. У апошні каляндарны тыдзень увогуле колькасць захварэлых крыху знізілася, — дадала **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Выпадкаў грыпу пакуль няшмат, гэта пераважна штамы A(H1N1) і A(H3N2). І выяўляюцца яны ў тых, хто не зрабіў прышчэпку.

**Прымаючы парацэтамол пры тэмпературы 37,5 градуса, вы часова аблягчаеце свой стан, але садзейнічаеце больш працягламу перыяду хваробы.**

Тым часам у Грузіі, а таксама ва Украіне ўжо зарэгістраваны смяротныя выпадкі ў выніку ўскладненняў грыпу A(H1N1), які яшчэ называюць свіным.

— Найперш няправільна лічыць гэты грып свіным. З 2009 года, калі адбылася маштабная пандэмія, ён стаў чалавечым, — падкрэсліла Іна Карабан. — У Грузіі і Украіне нізкі ахоп прышчэпкамі, з чым і звязана шырокае распаўсюджанне грыпу і ўскладненняў. Як паказваюць лічбы, цяжкія формы вострых рэспіраторных інфекцый развіваюцца менавіта ў невакцыянаваных пацыентаў — у 98 % выпадкаў.

Таму адзіны эфектыўны спосаб спецыфічнай прафілактыкі — вакцынацыя. Летась, напрыклад, не было ніводнага выпадку пнеўманії ў пацыентаў, якія атрымалі прышчэпкі супраць грыпу.

Іна Карабан адзначыла, што вакцыянаваны чалавек калі і захварэе грыпам, то ў вельмі лёгкай форме. Дарэчы, прышчэпкі ад грыпу сёлета атрымала 40,6 % беларусаў.

Каб не захварэць грыпам, калі вы не маеце прышчэпкі, спецыялісты раяць абмяжоўваць свае кантакты, больш часу праводзіць на свежым паветры, часцей праветрываць памяшканне і рабіць яго вільготную ўборку. Аптымальная тэмпература ў пакоі — не больш за 20 градусаў, пры ёй вірус не мае шанцаў распаўсюджвацца. Слізістая носа павінна ўвесь час быць вільготнай. Калі вы захварэлі, важна знаходзіцца ў цяпле, больш піць і памятаць, што павышэнне тэмпературы цела — ахоўная рэакцыя арганізма. Прымаючы парацэтамол пры тэмпературы 37,5 градуса, вы часова аблягчаеце свой стан, але садзейнічаеце больш працягламу перыяду хваробы, нагадваюць медыкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

Гучная справа

# Бабруйчаніну вынеслі смяротны прысуд

**Ахвярамі 36-гадовага бабруйчаніна сталі дзве мясцовыя жыхаркі — 26 і 27 гадоў. З ім яны пазнаёміліся ў ліпені мінулага года ў кавярні, потым на таксі адправіліся да яго на кватэру. У 7 гадзін раніцы на кароткі нумар 102 ад адной з жанчын паступіў сігнал з просьбай аб дапамозе. На жаль, яна не змагла дакладна патлумачыць, па якім адрасе іх шукаць. Тыя каардынаты, якія называла няшчасная, аказаліся не зусім дакладнымі. Калі аператыўнікі, нарэшце, выйшлі на забойцу, жанчынам ужо немагчыма было дапамагчы. Адной са сваіх ахвяр забойца нанёс больш за 70 удараў малатком і цвікадзёрам...**

Нагадаем, што яшчэ на папярэднім пасяджэнні, якое адбылося 8 студзеня, дзяржабвінаваўца Вольга Іванова запатрабавала для падсуднага найвышэйшую меру пакарання.

— Забойства было здзейснена наўмысна і з асаблівай жорсткасцю, — аргументавала яна. — Мужчына так і не назваў прычыну, з якой яно адбылося. Больш за тое, на яго рахунку гэта не адно цяжкае злачынства, у тым ліку забойства. Аднак на шлях выпраўлення ён так і не стаў.

Прысуд пакуль не ўступіў у сілу, на працягу 10 дзён абвінавачаны можа абскардзіць рашэнне суда.

Дарэчы, падчас следства пракуратура ўказвала таксама на тое, што бабруйская міліцыя неналежным чынам выконвала свае абавязкі па кантролі за падсудным.

— З 16 верасня 2017 года абвінавачаны стаяў на прафілактычным уліку ў крымінальна-выканаўчай інспекцыі УУС Бабруйскага гарвыканкама, як неаднаразова здзяйсняючы наўмысныя злачынствы. Але падчас праверкі таго, як была арганізавана работа, высветлілася, што выконвалася яна фармальна, — растлумачыла **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Алена ШУМЕЙКА.** — Як следства, абвінавачаны з 28 лютага да 20 ліпеня 2018 года — дзень здзяйснення злачынства — знік з поля зроку супрацоўнікаў міліцыі. Адсутнасць належнага прафілактычнага кантролю спрыяла здзяйсненню ім правапарушэнняў і асабліва цяжкага злачынства.

За неналежнае стаўленне да сваіх абавязкаў шэраг службовых асоб УУС Бабруйскага гарвыканкама былі прыцягнуты да дысцыплінарнай і матэрыяльнай адказнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Увага!

# НЕБЯСПЕЧНАЯ ЗАБАВА

## Траўматолагі б'юць трывогу: колькасць цяжкіх траўмаў падчас катання на цюбінгах павялічваецца

**Сёлетняй зімой больш за 140 дзяцей патрапілі ў дзве профільныя ўстановы аховы здароўя з траўмамі пасля катання на цюбінгах. Калі штосьці пайшло не так, гэта вясёлая забава можа абярнуцца сур'ёзнымі праблемамі — чэрапна-мазгавымі траўмамі, пашкоджаннямі ўнутраных органаў і пазваночніка, у тым ліку яго пераломамі. Нават дарослыя, не кажучы пра дзяцей, недаацэньваюць небяспеку гэтага «балiду», які здольны развіваць хуткасць да 100 км у гадзіну.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Горка ў парку Падмiколле горада Магілёва, дзе на мінулым тыдні ў нядзелю загінуў малады хлопец.

— І дзецям, і дарослым у катанні на цюбінгу падабаюцца два моманты: хуткасць і некантралюемасць. Але менавіта яны і становяцца прычынамі траўмаў. Кожны выхадны да нас трапляюць 10—15 дзяцей, якія траўміраваліся падчас такога катання. З пачатку зімы іх было больш за сотню, 35 шпіталізавана, у тым ліку трое — у вельмі цяжкім стане, аднаго з іх мне давялося ўжо двойчы аперыраваць, — расказвае **кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра дзіцячай нейрахірургіі, галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячай нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Міхаіл ТАЛАБАЕЎ**.

У РНПЦ траўматалогіі і артапедыі гэтай зімой трапіла з вышэйназваннай нагоды 38 дзяцей, восем з іх шпіталізавана. Апошняя юная пацыентка дастаўлена ў рэанімацыю літаральна ўчора.

— Пераважная большасць дзяцей паступае ў цэнтр дзіцячай нейрахірургіі, бо большасць траўмаў — ад удараў галавой. З пашкоджаннямі пазваночніка, пераломамі канечнасцяў звяртаюцца да нас, у РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, — расказвае **загадчык лабараторыі захворванняў і наступстваў траўмаў пазваночніка і спіннога мозгу Андрэй БАБКІН**.

Катанне на цюбінгу, а разам з ім і траўмы, сталі распаўсюджанай з'явай тры-чатыры гады таму. Сёлета сітуацыя пагоршылася — два чалавекі загінулі. Медыкі сыходзяцца ў адным — цюбінг стаў даступным спосабам уцягнуць дзіця ў непрыемнасці, і бацькі часта не ўсведамляюць гэтага.

**Спецыялісты раяць: катацца варта толькі там, дзе няма перашкод у выглядзе дрэваў, слупоў і камянёў, а таксама немагчымы выезд на праезную частку. Дзецям варта катацца ў прысутнасці дарослых, а цюбінгі падчас продажу павінны мець сертыфікаты.**

— Калі раней гэта прылада выкарыстоўвалася выключна як спартыўны інвентар — у месцах, прызначаных для бяспечнага катання, пад наглядам інструктараў і пры адпаведнай падрыхтоўцы, то зараз яна ў вольным продажы. Дзіця не можа сябе кантраляваць, у яго няма адпаведнай экіпіроўкі, якая змякчае ўдары, да таго ж многія горкі не прызначаны для катання, — кажа **траўматолаг-артапед вышэйшай катэгорыі прыёмнага аддзялення РНПЦ траўматалогіі і артапедыі Андрэй ЯРАШЭВІЧ**.

У Следчым камітэце праводзіцца праверка па сямі фактах цяжкага траўміравання падчас катання на цюбінгу, у тым ліку двух смяротных. У Савет Міністраў накіравана пісьмо з прапановамі па ўдасканаленні парадку вырабу, рэалізацыі і эксплуатацыі цюбінгаў, паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення працэсуальнага кантролю Следчага камітэта Сяргей ЦІШУК**.

— Адправіць дзіця катацца на цюбінгу — тое ж самае, што пасадзіць у машыну без тармазоў. Важна, каб і самі бацькі давалі ўстаноўку на бяспечныя паводзіны, — падкрэсліў Сяргей Цішук.

— Калі дзіця атрымлівае траўму, бацькі часта недаацэньваюць яго стан — вядуць дадому, прыкладаюць лёд, не ўсведамляючы, што могуць страціць сагае на працягу найбліжэйшых гадзін. Па медыцынскую дапамогу варта звяртацца неадкладна, — папярэджвае **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Юлія ГАНЧАРОВА**.

**Алена КРАВЕЦ.**

Экспертыза

# ФІШЫНГ: НА КРУЧКУ Ў ХАКЕРА



**Слова «фішынг» увайшло ў лексікон не так і даўно — прыкладна два дзесяцігоддзі таму. Прыйшло яно з англійскай мовы і азначае бяскрыўдны, на першы погляд, тэрмін «рыбалка». Вось толькі «рыбак» тут — хакер, які імкнецца падсадзіць на кручок даверу звычайных карыстальнікаў інтэрнэту, каб выманіць у іх персанальныя даныя для асабістых мэтаў, якія ідуць насуперак закону. Разам з тым змагацца з такімі «рыбакамі» па сілах кожнаму. Як жа? На канкрэтных прыкладах гэта разбірае начальнік аддзела праграмных і сеткавых экспертыз Цэнтральнага апарату судовых экспертыз Андрэй МАЛАШКЕВІЧ.**

Са спробамі фішынгу сутыкаліся ўсе карыстальнікі электроннай пошты. Хто не чытаў дасланую і перакладзеную праз Google слязлівую гісторыю пра тое, як у нейкага выхадца з Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі ці Акіяніі засталося ў спадчыну некалькі мільёнаў долараў? Але каб іх займець, трэба пералічыць пэўную суму на ўказаны рахунак. А пасля за гэта вам абяцаюць аддзячыць. Узрадаваны карыстальнік сеціва праводзіць плацеж (часта на суму, выражаную ў чатырохзначных лічбах амерыканскай валюты), а наўзамен атрымлівае... нічога. Гэты спосаб выманьвання грошай з'явіўся яшчэ ў 1990-я і атрымаў назву «нігерыйскія лісты», бо большасць гэтых паведамленняў так ці інакш была звязана з афрыканскай Нігерыяй.

Але цяпер электронная пошта сыходзіць на другі план. Усё больш мы карыстаемся ў інтэрнэт-зносінах месенджарамі — УКантакце, Facebook, Telegram, WhatsApp... Зразумела, што махляры рана ці позна прыйшлі б і сюды. У адрозненне ад «нігерыйскіх лістоў», тут гутарка ўжо персаналізавана — хакер звяртаецца да канкрэтнага карыстальніка. Прычым робіць гэта ад імя сапраўднага знаёмага. Усё, што для гэтага трэба — узламаць профіль у месенджары або сацыяльнай сетцы. Асаблівасцю такіх размоў становіцца «ўзяцце быка за рогі». Без доўгіх уступаў хакер пад маскай знаёмага пачынае выманьваць грошы або персанальныя даныя.

— Легенда простая, — кажа Андрэй Малашкевіч. — Сябар аказаўся за мяжой без грошай, скончыўся тэрмін дзеяння банкаўскай карты ці нешта яшчэ. І ў асабістым паведамленні ляціць слёзная просьба аб дапамозе. Зламыснікі імкнуцца згуляць на псіхалогіі: хто з нас не трапляў за сваё жыццё хоць раз у складаную сітуацыю? І атрымаць на гэтым жывыя долары-еўра-рублі. Для пераводу грошай махляры прапаноўваюць або віртуальныя карты міжнародных плацежных сэрвісаў, або банкаўскі пластык, эмітаваны ў замежжы. Гэта робіцца для таго, каб максімальна заблытаць сляды. Да таго часу, пакуль вы не зробіце перавод, вам будуць усё падрабязна тлумачыць, куды пераходзіць і на які раздзел націскаць. «Кліента» на гэтым этапе адпускаць вельмі нявыгадна — на пошук акаўнта і яго ўзлом быў затрачаны час. Але як толькі грошы былі адпраўлены — сувязь вокамгненна абрываецца. Назаўсёды. Маўр зрабіў сваю справу, маўр можа сыходзіць.

Адзіны паратунак у такой сітуацыі — як мага хутчэй тэлефанаваць у банк, які выпусціў карту, з якой вы перавялі грошы, з просьбай вельмі аператыўна заблакаваць плацеж. А таксама даведацца па пакінутых махляром рэквізітах, які банк выпусціў картку, на якую грошы былі адпраўлены, і тэлефанаваць з аналагічнай просьбай і туды. Праўда, тут можа згуляць не на карысць моўны бар'ер — ці здолееце вы растлумачыць сваю просьбу, напрыклад, па-англійску, калі ваш суразмоўнік знаходзіцца па-за акіянам?

Але гэта адзін з магчымых варыянтаў развіцця падзей. Шырокае распаўсюджанне атрымаў варыянт накшталт «я скіну на тваю карту грошы, а ты аддасі мне іх наяўнымі». І вось тут пачынаецца самае цікавае. «Сябар» рознымі шляхамі просіць назваць код CVV ад карткі, каб перавесці туды грошы. А вось на гэтым этапе ўсё пачынае залежаць ад абачлівасці ахвяры. Калі вы хоць бы раз клалі грошы на картку, скажам, у банкамаце, то ўспомніце: трэба запоўніць усяго два полі звестак, якія датычацца самой карткі. Гэта яе нумар і тэрмін дзеяння. Ні пра якія іншыя коды гаворка не ідзе. І калі пра тое, што PIN-код, які мы ўводзім пры любой аперацыі з выкарыстаннем карткі ў банкамаце або тэрмінале, нельга перадаваць іншым асобам, гаворана-пераговорана ўжо больш за два дзясяткі гадоў, то пра код CVV чула ўжо менш людзей. Ён выкарыстоўваецца для праўдзення аплаты ў інтэрнэце.

— Літаральна напярэдадні гэтай сустрэчы наш супрацоўнік добра патроліў такога хакера. Вось, калі ласка, — працягвае эксперт аркуш паперы з раздрукаваным скрынам з экрана смартфона.

Кароткі змест перапіскі: праз акаўнт аднаго з сяброў звярнуліся з пытаннем, якім банкам эмітавана картка. Пасля гэтага прыйшло паведамленне, што, маўляў, трэба вывесці грошы з адной з віртуальных плацежных сістэм, але там скончыўся тэрмін прыдатнасці. Для гэтага падыдзе картка суразмоўніка. І нават абяцалі заплаціць за дапамогу! Але хакер не чакаў прапановы прыехаць да сябра, каб ён паказаў, як гэта рабіць. І літаральна праз хвіліну прыляцеў допіс: «Прашу прабачэння! Гэта мяне ўзламалі!» Сам дыялог заняў усяго шэсць хвілін...

**Таму лепш за ўсё пры такой сітуацыі патэлефанаваць сябру і спытаць, ці сапраўды ён пісаў гэтае паведамленне. Гэта той выпадак, калі галасавая сувязь дае сто ачкоў наперад перапісцы ў месенджарах.**

— Даверлівасць нашых людзей проста ўражвае, — канстатуе Андрэй Малашкевіч. — Хакер можа выведаць нават нумар тэлефона. Ён патрэбны для афармлення віртуальнага электроннага кашалька. Здавалася б, што можна зрабіць, ведаючы адзін толькі нумар? На яго прыйдзе SMS-паведамленне, у якім папросяць пацвердзіць сапраўднасць аперацыі, увёўшы дасланы код. Дык мы сутыкаліся з тым, што ахвяры спакойна паведамляюць коды з гэтых SMS. Усё, хакер атрымаў доступ да вашага рахунку і падключыць вам які-небудзь платны сэрвіс. А даведаецеся вы пра гэта толькі тады, калі грошы на балансе скончацца значна раней, чым звычайна. Толькі вось пошукі зламысніка ў такім выпадку рызыкуюць істотна зацягнуцца — хакеры, як правіла, дзейнічаюць з-за мяжы.

**Калі ж хакеры дзейнічаюць «пабуйному», то яны атакуюць кампаніі. На электронную пошту дасылаецца на першы погляд бяскрыўдны ліст. Але да яго далучана праграмка-вірус, якая маскіруецца, напрыклад, пад акт выкананых работ.**

Бухгалтар без задняй думкі адкрывае ліст, пампуе файл, запускае яго і... атрымлівае паведамленне аб тым, што ўсе даныя зашыфраваны. А каб усё вярнуць назад, трэба заплаціць. Пасля атрымання грошай хакер абяцае даслаць праграму-дэшыфратар, якая нібыта верне ўсё назад.

Менавіта таму атрымлівайце пацвярджэнне па звычайнай тэлефоннай сувязі ад таго, хто адправіў вам дакумент. Калі ж ліст ад невядомага адпраўніка, то лепш яго выдаліць, не адкрываючы. Яшчэ адзін дагэтуль актуальны метад фішынгу — прыцягненне карыстальніка замест патрэбнага сайта на падробны, дзе трэба ўвесці лагін і пароль, або нумар плацежнай карткі ці нешта яшчэ. Тым самым вы аддаяце свае даныя ў рукі зламыснікаў самі. Пры гэтым адрозніваць назвы сайтаў могуць усяго толькі адной непрыкметнай літарай. Таму рэкамендую карыстацца закладкамі ў браўзеры.

Як жа засцерагчыся ад гэтай навалы?

— Як ужо казалася вышэй, кожную аперацыю, якая датычыцца грошай або адпраўкі лістоў па электроннай пошце, лепш прагаворваць і па тэлефоне, — раіць эксперт. — І не паддавацца на просьбы паведаміць які-небудзь код. Для плацяжоў у інтэрнэце лепш завесці спецыяльную картку, дзе грошы будуць знаходзіцца лічаныя хвіліны, а ўвесь астатні час на рахунку будзе нулявая сума. А для сацыяльных сетак лепш карыстацца двухфактарнай аўтарызацыяй, калі на ваш мабільны нумар прыходзіць SMS з кодам пацвярджэння. Такім чынам, гэта той выпадак, калі наша бяспека — сапраўды ў нашых руках.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

10 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15856)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Хелена МЕРААІ: «Мару пра шматмільённую аўдыторыю»



**Пакуль яе аднагодкі вучацца ў школе, а ў вольны час гуляюць з сябрамі, яна скарае новыя музычныя вяршыні. Хелена Мераал ў свае 15 гадоў ужо прыняла ўдзел у шматлікіх конкурсах і зараз не ўяўляе свайго жыцця без спеваў.**

***— Як у тваім жыцці з'явілася музыка?***

— Упершыню я заспявала разам з маёй прабабуляй, гэта была вядомая «Нясе Галя воду». А мой дэбют на сцэне адбыўся ў тры гады на конкурсе для настаўнікаў. Я і мая выхавальніца разыгрывалі сцэнку з «Мэры Попінс». Я была дзяўчынкай Джэйн. Для гэтага нумара нават вопратку спецыяльна купілі, каб вобраз быў падобны на маю гераіню. Магчыма, менавіта ў той дзень я і зразумела, што сцэна — гэта тое месца, дзе я адчуваю сябе вельмі добра.

***— Хто быў тваім настаўнікам на шляху да яе?***

— Усяго ў мяне было чатыры педагогі: у дзіцячым садзе, гімназіі, музычнай школе і ў студыі. З апошнім я займаюся і дагэтуль. Яе завуць Вольга Драздова, з ёй я ўдзельнічала ў розных праектах: «Х-Фактар», дзіцячая «Новая хваля — 2016», «Голас. Дзеці-3», дзіцячае «Еўрабачанне-2017». Ведаеце, думаю, на гэтым наш сумесны творчы шлях толькі пачынаецца.

***— Шоу «Голас» было тваім першым маштабным праектам?***

— Так, маеш рацыю. Першы раз падала на яго заяўку ў 2014 годзе, але тады не прайшла. Другая мая спроба была ў 2015 годзе, напэўна, з больш падыходзячымі песнямі. Дарэчы, тады я ўжо і перайшла да Вольгі Драздовай.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

З «базай» у галаве

# Інфарматыка: для ІТ і для жыцця

## Чаму трэба раздзяляць праграму на два ўзроўні?



**Прадмет «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі» з'явіўся ў школьнай праграме больш як 30 гадоў таму, калі пра існаванне камп'ютарнай тэхнікі савецкія школьнікі ведалі выключна тэарэтычна. Сучасныя дзеці, у адрозненне ад пакалення 1980-х, з камп'ютарамі і шматлікімі гаджэтамі на «ты» і ў многіх пытаннях апярэджваюць сваіх бацькоў і нават школьных настаўнікаў. Уключыць-выключыць камп'ютар, скапіраваць файл, загрузіць і адправіць па інтэрнэце фатаграфію могуць нават вучні пачатковых класаў. Але ж ці можна назваць гэтыя найпрасцейшыя навыкі лічбавай адукаванасцю? Ці не адстае сённяшняя школьная праграма ад патрэб інфармацыйнага грамадства? Чаму трэба вучыць на школьных уроках інфарматыкі? У якім узросце распачынаць яе выкладанне? Якая школьная інфарматыка патрабуецца сучаснай Беларусі? З гэтымі пытаннямі паспрабавалі разабрацца ўдзельнікі панэльнай дыскусіі, якая адбылася ў рамках II Міжнароднай спецыялізаванай навукова-тэхнічнай выстаўкі-форуму «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» (ITE 2018).**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Усё — у тваіх руках!

# РЫНГ І ПОДЫУМ ДЛЯ... ВЕТУРАЧА,

## або Што вы ведалі і не ведалі пра шлях да звання «Міс»

**Быць мадэллю і выкладчыцай, лячыць жывёл і ўдзельнічаць у конкурсах прыгажосці, баксіраваць і танцаваць... немагчыма? А вось актыўная і жыццярадасная Юлія КУЗЬМЕНКА займаецца ўсім гэтым з вялікім захапленнем і задавальненнем. У свае 23 гады яна мае чырвоны дыплом Смілавіцкага дзяржаўнага аграрнага каледжа, дыплом Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, тытул «Міс Віцебск — 2015». Летась Юлія ўвайшла ў трыццатку найлепшых на конкурсе «Міс Беларусь», пачала выкладаць ветэрынарную дысцыпліну ў родным каледжы і танцаваць у групе падтрымкі Ice Girls на гульнях хакейнай каманды «Дынама-Мінск».**

— Нарадзілася я ў Мінску, — расказвае Юлія. — У дзяцінстве была спакойнай і ціхай. Але калі прыязджалі госці, заўсёды для іх танцавала. Многія думалі, што я звяжу жыццё з харэаграфіяй. А яшчэ — майстравала адзенне. Напрыклад, сшывала топік са спадніцай. Як толькі мама сыходзіла, адразу выварочвала ўсё з шафы, абувала туфлі на абцасах, чапляла на шыю каралі. Памятаю, вісела там яшчэ бліскучая сукенка: мне яна, вядома, была вялікая, але я марыла ее апрануць, бо лічыла моднай і стыльнай... У школе я была замкнутай, ні з кім асабліва не мела стасункаў, не была душой кампаніі. На перапынках сядзела ў класе, каб мяне ніхто не чапаў. Гэта потым «прарвала», у каледжы: там мы весела бавілі час, танцавалі, рыхтаваліся да мерапрыемстваў... Што датычыцца конкурсаў прыгажосці, пра іх нават размовы не ішло. Я была не вельмі сімпатычным дзіцем *(смяецца)*. Пазней, калі стала ростам вышэйшай за іншых, у мяне пачалі пытаца: «Ты мадэль?». Я адказвала: «Не, вы што, мне не падабаецца, ніколі ў жыцці не буду ёй...» Але так сталася, што ў гадоў сямнаццаць пайшла на першы кастынг для рэкламы *(усміхаецца)*...



«Міс Віцебск — 2015».

Прафесію ветэрынара Юля выбрала не адразу. Доўгі час хацела быць эканамістам, бо добра ведала матэматыку. Нават хадзіла на матэматычныя курсы ў архітэктурна-будаўнічы ліцэй.

— Але ў рэшце рэшт паслухалася маму, — тлумачыць дзяўчына. — Яна сказала, што быць мне ветэрынарам, бо я заўсёды цягнула дадому катоў, сабак, чарвякоў, жукоў. Збірала хрушчоў, магла павука, таракана ў рукі ўзяць: «Мама, паглядзі!». Пастаянна з намі жылі толькі кот і сабака. Аднак я брала дадому прыблудных жывёл, лячыла іх, карміла, пакуль не знаходзіла ім новую сям'ю.

Аб тым, што паступіла ў Смілавіцкі аграрны каледж, Юля ні разу не пашкадавала. Разумела, што давядзецца лячыць кароў, свіней, але не баялася. Яна заўжды была напагатове, калі трэба было зрабіць укол, узяць кроў, паставіць дыягназ.

А потым была вучоба ў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Менавіта там 19-гадовая Юлія і вырашыла паўдзельнічаць у конкурсе «Міс Віцебск — 2015». Хадзіла на заняткі, паралельна на рэпетыцыі. Трэніроўкі, чаканні, выступленні, доўгачаканы фінал і... бліскучая перамога!

— Пасля гэтай падзеі пачала адчуваць сябе па-іншаму, з'явілася больш адказнасці, — успамінае прыгажуня. — Усё ж «Міс» такога вялікага горада... Было шмат інтэрв'ю, фотасесій. Нарэшце мне параілі паўдзельнічаць у «Міс Беларусь». І я... не прайшла. Вельмі перажывала. Аднак потым сталі запрашаць на іншыя конкурсы, і ўсё закруцілася зноў...

Зусім нядаўна Юлія скончыла акадэмію. Потым быў адпачынак у Маямі, а пасля пачалася работа. І не дзе-небудзь, а ў родным смілавіцкім каледжы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# Інфарматыка: для ІТ і для жыцця

## ГАДЗІНА ЗАМЕСТ ДЗВЮХ

Але спачатку крыху замежнага досведу. У шэрагу краін вывучэнне інфарматыкі, уключаючы асновы праграмавання, сталі пераносіць у пачатковую школу. Гэтым шляхам пайшлі, напрыклад, Англія, Паўднёвая Карэя і Японія. У суседняй Украіне вывучэнне інфарматыкі цяпер распачынаецца з другога класа. У Расіі за кошт рэгіянальнага кампанента ўводзіць інфарматыку можна хоць з першага класа. А, напрыклад, у асобных штатах ЗША інфарматыка ўвогуле не з'яўляецца абавязковым прадметам у школе. Спрэчкі вакол гэтай школьнай дысцыпліны не сціхаюць. Шмат прыхільнікаў ёсць у ідэі больш ранняга вывучэння інфарматыкі (хоць бы з другога класа). Разам з тым дастаткова вялікая колькасць іх апанентаў лічаць, што ў школе ўвогуле не патрэбны асобны прадмет «Інфарматыка». Усё, што датычыцца апрацоўкі інфармацыі (скажам, як напісаць тэкст ці зрабіць прэзентацыю), павінна выкладацца дзецям на іншых уроках. Напрыклад, у Эстоніі, якая лічыцца адной з самых «прасунутых» у лічбавым плане краін у Еўропе, асобнага прадмета «Інфарматыка» няма: яна інтэграваная ва ўсе вучэбныя прадметы.

— Мой стаж выкладання інфарматыкі складае 28 гадоў, і я магу параўнаць, як яна развівалася, якой яна была і якой стала, — разважае **Вераніка ЛАКЦІНА, настаўніца з віцебскай гімназіі № 8,** якая падрыхтавала шматлікіх пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд па гэтай дысцыпліне. — Шчыра кажу, я настальгірую па тых часах, калі ў нас было профільнае вывучэнне інфарматыкі і дзве гадзіны інфарматыкі ў тыдзень, а не адна, як цяпер. Сёння мы вывучаем два кірункі: інфармацыйныя тэхналогіі і праграмаванне. Так, у нас пашырылася вывучэнне інфармацыйных тэхналогій, але мы звузіліся ў плане алгарытмізацыі і праграмавання. Я працую ў гімназіі і бачу, якія вялікія цяжкасці ўзнікаюць у дзяцей пры вывучэнні другога кірунку. За выдзеленыя гадзіны асвоіць праграмаванне ў поўнай ступені вельмі складана.

Цяперашнюю сферу ІТ падымаюць тыя нашы дзеці, якіх мы выпусцілі дзесяць гадоў таму — у 2008 годзе, калі скончылася профільная інфарматыка. Яны стаяць зараз каля штурвала. А што нас чакае далей, хутка даведаемся...

— Я адпрацаваў у ІТ-галіне 18 гадоў, быў праграмістам, займаўся кіраваннем праектамі і добра ведаю, якія спецыялісты там патрабуюцца, — кажа **дырэктар Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні» Аляксандр ХОМІЧ.** — Сёння 20 працэнтаў тых, хто працуе ў ІТ-сферы, гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў. Студэнты працуюць ужо з другога і нават з першага курса. І школьная інфарматыка — гэта фактычна той багаж, з якім яны прыходзяць у ІТ-кампанію. З таго, што я назіраю, мяне вельмі засмучае тая акалічнасць, што на ўроках інфарматыкі ў беларускай школе вучаць інструментам, а інструменты вельмі хутка старэюць, таму трэба пераглядаць падыходы і даваць дзецям магчымасць самастойна выбіраць інструменты, з дапамогай якіх яны будуць вырашаць пастаўленыя задачы.

## КАМП'ЮТАР — ТОЛЬКІ ІНСТРУМЕНТ

«Пра школьную інфарматыку магу сказаць толькі адно — гэта сумна, — канстатуе **Леанід ЛОЗНЕР, сузаснавальнік кампаніі EPAM Systems, член праўлення Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні»**. — Я ведаю гэта ад сваіх дзяцей. Мне нават не падабаецца сама назва прадмета. З майго пункту гледжання, тое, чаму трэба навучаць у школе, павінна называцца computer science, па-нашаму нешта накшталт «вылічальнай навукі», але не камп'ютарнай, бо камп'ютар — гэта толькі інструмент: сёння ён адзін, а заўтра — іншы. Вывучаць інструменты бессэнсоўна. Канешне, карысна ведаць, што такое лінейка, але ж у нас няма ў школе прадмета, які вывучае лінейкі і транспарціры, а ёсць матэматыка, фізіка... Транспарціры за гэтыя гады, напэўна, таксама змяняліся, аднак калі мы не збіраемся пісаць дысертацыю аб іх эвалюцыі, то і марнаваць час на іх вывучэнне не трэба. З пункту погляду вылічальнай навукі галоўнай, безумоўна, з'яўляецца алгарытмізацыя. Яе і трэба вывучаць. Мне таксама падаецца дзіўным, што мы спрабуем вынайсці нейкую асаблівую інфарматыку для Беларусі.

— Трэба разумець, з кім мы працуем, для чаго, як гэта робім, і хто працуе? — разважае **Аляксандр БУДСЛАЎСКІ, выкладчык БДУ і Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі, які шмат гадоў працаваў са школьнікамі, старшыня журы рэспубліканскай алімпіяды па інфарматыцы сярод школьнікаў.** — Ільвіная доля сённяшняй школьнай інфарматыкі прысвечана выхаванню дасведчаных карыстальнікаў, а для многіх дзяцей гэта насамрэч сумна. Інфарматыка ў нас распачынаецца з шостага класа, у ідэале да гэтага ўзросту ўсе вучні павінны падысці на аднолькавым узроўні камп'ютарнай адукаванасці, а ён, насамрэч, ва ўсіх розны. І тэхніка розная ў сем'ях, і якасць інтэрнэту. Да таго ж у сістэму адукацыі часта прыходзяць людзі, якія не змаглі трапіць у ІТ-галіну, таму ўзровень многіх школьных педагогаў нізкі. Настаўнік інфарматыкі нават не заўсёды можа ўстанавіць аперацыйную сістэму на камп'ютары. Педагогі, якія працуюць у школе, проста ведаюць школьны курс, а павінны ведаць удвая больш. Таму для таго, каб прыцягнуць у сістэму адукацыі добрых спецыялістаў, трэба іх стымуляваць.

**«Дзеці павінны бачыць сувязь паміж інфарматыкай і навакольным светам».**

Ёсць меркаванне, што ў школе павінны быць дзве інфарматыкі: бытавая, на якой школьнікі будуць проста вучыцца выкарыстоўваць тыя тэхналогіі, што ўжо ёсць, і другі кірунак — праграмаванне (калі мы ствараем, а не толькі карыстаемся). Алімпіяда па інфарматыцы — гэта фактычна алімпіяда па праграмаванні. Так, у школе складана выхаваць паўнавартаснага праграміста, але зразумець, ці можа і хоча вучань гэтым займацца, і развіць у яго пэўныя навыкі, можна ўжо ў школьныя гады. Між іншым, некаторыя падлеткі пачынаюць зарабляць на ўласных праектах даволі рана. Бытавую інфарматыку павінны вывучаць усе, а вось праграмаванне можа быць курсам па выбары, але ў такім выпадку для таго, каб паступаць у ВНУ на пэўныя спецыяльнасці, вывучэнне гэтага курса ў школе павінна быць абавязковым.

**«20 працэнтаў тых, хто працуе ў ІТ-сферы, гэта маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў».**

Па словах **настаўніка інфарматыкі з Ліцэя БДУ, аўтара падручнікаў Анжалікі ЛАПО** (яна таксама падрыхтавала шмат пераможцаў спаборніцтваў па інфарматыцы), у Міністэрства адукацыі яшчэ ў 2003—2004 гадах уносілася прапанова вывучаць інфарматыку ў старшай школе па розных варыянтах: мінімум — для ўсіх, а далей даваць магчымасць выбару. Варыятыўная частка залежала ад профілю навучання: меркавалася, што будучыя філолагі могуць вывучаць графічныя рэдактары і выдавецкія сістэмы; хімікі і біёлагі — камп'ютарнае мадэляванне, рэдактары хімічных формул; фізікі і матэматыкі — непасрэдна праграмаванне. Сёння ж у беларускай школе ёсць толькі адна гадзіна ў тыдзень на ўсё.



## КАЛІ НЕ ЗБІРАЕШСЯ БЫЦЬ ПРАГРАМІСТАМ...

Інфарматыка ў тым выглядзе, як яна выкладаецца цяпер у нашых школах, уключае некалькі важных блокаў: гэта не толькі камп'ютарная асвета (атрыманне базавых ведаў пра камп'ютар, звестак пра аперацыйныя сістэмы, навыкаў для работы з офіснымі праграмамі), але і развіццё логікі, алгарытмічнага мыслення, непасрэдна стварэнне камп'ютарных праграм. Дарэчы, калі распачалася работа над новай праграмай па інфарматыцы, гучалі прапановы з боку бацькоў увогуле прыбраць раздзел «Алгарытмізацыя і праграмаванне» з курса інфарматыкі ў школе. Аргумент — «нашы дзеці не будуць праграмістамі». Адны выступалі за інфарматыку з дзіцячага садка, іншыя — за яе выключэнне са школьнай праграмы або, як варыянт, вывучэнне толькі ў профільных класах ці на старшай ступені школы. Частка бацькоў лічыць, што інфарматыка — занадта складаная для дзяцей дысцыпліна, а іншыя, наадварот, сцвярджаюць, што школьная праграма па інфарматыцы празмерна лёгкая.

Анжаліка Лапо — адзін з аўтараў новых дапаможнікаў па дысцыпліне. Іх адметнасць заключаецца ў паралельным размяшчэнні тэарэтычнай і практычнай частак, бо ў класічных падручніках яны размешчаны паслядоўна. Такі прыём дазваляе палепшыць успрыманне матэрыялу вучнямі. Для многіх заданняў падрыхтаваныя спецыяльныя матэрыялы, якія можна знайсці на партале Нацыянальнага інстытута адукацыі. Ужо ёсць электронная падтрымка дапаможнікаў для 6 і 7 класа, а для 8 класа яна хутка з'явіцца. Калі на новую праграму пяройдуць 10 і 11 класы, для іх падрыхтуюць адзіны дапаможнік, дзе будуць прымяняцца зусім новыя падыходы.

— У папяровай версіі будзе ўтрымлівацца толькі тэорыя — тэарэтычныя асновы інфарматыкі, алгарытмізацыя, праграмаванне, а ўсе інфармацыйныя тэхналогіі (інструменты) будуць у электронным выглядзе, каб была магчымасць па меры неабходнасці аператыўна абнаўляць гэты кірунак, — тлумачыць Анжаліка Лапо.

## КРЫТЫЧНАЕ МЫСЛЕННЕ І КРЭАТЫЎНАСЦЬ

— Алгарытмізацыю можна вывучаць нават на драўляных кубіках, — лічыць Леанід Лознер. — Мой дзесяцігадовы сын, які прыйшоў са школы, запытаўся ў мяне: «Тата, а ці ведаеш ты алгарытм прыгатавання яечні?» І расклаў гэты працэс па аперацыях: адкрыць халадзільнік, узяць яйкі, уключыць пліту, паставіць патэльню і гэтак далей. Прашу заўважыць: тут слова «камп'ютар» не прысутнічае. Алгарытмізацыя — гэта навучанне мастацтву мыслення.

**«Бытавую інфарматыку павінны вывучаць усе, а вось праграмаванне можа быць курсам па выбары».**

— Я дзвюма рукамі за адукацыйную інфарматыку. Ёсць адзін узровень — неабходны для нармальнай работы і жыцця (уменне працаваць з офіснымі праграмамі, ствараць прэзентацыі, шукаць патрэбную інфармацыю ў інтэрнэце...) і другі (спецыфічныя веды, якія цікавыя і патрэбныя не кожнаму). І калі б школа дазволіла раздзяліць гэтыя два ўзроўні, гэта быў бы вялікі прагрэс, — падкрэслівае Аляксандр Хоміч. — Яшчэ было б нядрэнна, каб інфарматыку вывучалі ў звязцы з нейкімі іншымі прадметамі, таму што дзеці павінны бачыць сувязь паміж інфарматыкай і навакольным светам і ўмець выкарыстоўваць яе інструменты для вырашэння іншых задач. Абстрактныя веды нікому не патрэбныя. У ІТ цэняцца спецыялісты, якія ўмеюць задаваць пытанні, з развітым крытычным мысленнем, таму што там даводзіцца вырашаць задачы, якія ніхто раней не вырашаў, і калі ты будзеш проста рабіць тое, што табе скажуць, не падвяргаючы сумненням, нічога не атрымаецца.

— Усе, напэўна, ведаюць фразу «Калі ты валодаеш інфармацыяй, ты кароль свету». Але гісторыя з WikiLeaks сведчыць, што любую інфармацыю, як бы старанна яе ні захоўвалі, можна скрасці і з дапамогай інтэрнэту вельмі хутка распаўсюдзіць. Але калі інфармацыя ўжо не з'яўляецца канкурэнтнай перавагай на рынку, то што можа быць такой перавагай? — задаецца пытаннем **Маргарыта ЛАЗАРАНКОВА, эксперт у галіне крэатыўнай эканомікі, сузаснавальнік тэхналагічнай канферэнцыі Emerge.** — Я адношуся да тых, хто лічыць, што сёння гэта крэатыўнасць, здольнасць генерыраваць новыя ідэі штодня, вырашаць задачы нестандартнымі спосабамі. Скапіраваць і распаўсюдзіць такую здольнасць складана, яе трэба старанна развіваць. Было б выдатна, калі б на ўроках інфарматыкі больш увагі ўдзялялася развіццю крэатыўнасці, што натхняла б падлеткаў на стварэнне ўласных прадуктаў. І такія прыклады ёсць, калі мы на канферэнцыі літаральна ў апошні момант даведваемся, што за цікавым і сур'ёзным праектам стаіць... 14-гадовы падлетак.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ

# У РЭЙД ВЫХОДЗІЎ «ЗІМОВЫ ПАТРУЛЬ»

**У перыяд школьных канікул Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах праводзілі сумесную акцыю «Зімовы патруль», скіраваную на прафілактыку надзвычайных сітуацый на вадаёмах у зімовы перыяд і папярэджанне выхаду людзей на неакрэплы тонкі лёд.**

У мерапрыемствах былі задзейнічаны байцы маладзёжных атрадаў аховы правапарадку БРСМ і супрацоўнікі АСВОД. Штодня з 11.00 да 15.00 яны патрулявалі берагі рэк і азёр, на якіх размешчаны выратавальныя станцыі, і праводзілі тлумачальную работу з насельніцтвам па няўхільным выкананні правілаў паводзін на вуліцы зімой, на лёдзе, мерах засцярогі, а таксама на тэму таго, што неабходна ведаць і зрабіць, калі чалавек праваліўся ў ваду альбо калі камусьці патрэбна дапамога. Арганізатарамі было вызначана 66 месцаў дыслакацыі «Зімовага патруля».

*Ініцыятывы*

# Стыпендыі ад стваральнікаў «танчыкаў»

**Рэалізацыю пілотнага праекта «Стыпендыі Wargaming» разгледзелі ў рамках візіту вядучага распрацоўшчыка камп'ютарных гульняў у Беларускі дзяржаўны універсітэт. Удзельнікамі сустрэчы сталі першы намеснік міністра адукацыі Ірына Старавойтава, рэктар БДУ Андрэй Кароль, саўладальнік Wargaming Уладзімір Кіслы і дырэктар аналітычнага цэнтра «EcooM» Сяргей Мусіенка. Таксама на мерапрыемства былі запрошаны дэканы і больш як сто студэнтаў універсітэта.**

Ініцыятыва па прысуджэнні стыпендый скіравана на стымуляванне і матывацыю моладзі да навуковай дзейнасці. Уладзімір Кіслы падкрэсліў, што фінансавая падтрымка дазволіць стварыць у БДУ кластар студэнцкіх ідэй і праектаў рознай навуковай тэматыкі, не звязанай са спецыфікай работы кампаніі.

Галоўным пытаннем падчас абмеркавання стаў механізм рэалізацыі праекта. Было вызначана, што на пачатковым этапе прэтэндаваць на атрыманне стыпендый змогуць студэнты другіх-трэціх курсаў чатырох факультэтаў БДУ: фізічнага, хімічнага, прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, а таксама радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. Формай адбору абраны конкурс, згодна з якім кандыдатам неабходна мець высокі бал паспяховасці, яны павіны займацца навукова-даследчай дзейнасцю і напісаць матывацыйнае эсэ. Усяго будзе выдзелена 16 стыпендый — па чатыры на кожны згаданы факультэт. У абмеркаванні актыўна прымалі ўдзел таксама студэнты. Шматлікія іх заўвагі будуць улічаны пры дэталёвай распрацоўцы палажэння аб «Стыпендыі Wargaming». Яго выніковы варыянт прадставяць да канца лютага.

Пры паспяховай рэалізацыі пілотнага праекта на згаданых факультэтах БДУ плануецца пашырэнне колькасці ўдзельнікаў як за кошт іншых факультэтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, так і іншых беларускіх ВНУ.

*Экскурсія + квэст*

# ТАЯМНІЦЫ ДВОРЫКА БДУ

**У Мінску з'явіўся незвычайны экскурсійны маршрут — па ўнутраным дворыку БДУ.**

Над яго зместам працавалі 11 студэнтаў гістарычнага факультэта ўніверсітэта. На працягу некалькіх месяцаў яны вывучалі архіўныя матэрыялы Музея БДУ. Каштоўнай крыніцай інфармацыі для іх стала таксама кніга «Універсітэтазнаўства» прафесара Алега Яноўскага.

Унікальнасць праекта заключаецца ў камбінацыі традыцыйнага экскурсійнага фармату з гульнявымі элементамі квэсту. Спачатку гасцям БДУ ў храналагічнай паслядоўнасці раскажуць пра жыццё і дзейнасць выбітных асоб, помнікі і бюсты якім устаноўлены на тэрыторыі дворыка. Наведвальнікі даведаюцца пра гісторыю карпусоў ВНУ ў даваенныя і пасляваенныя гады. Асаблівая ўвага будзе аддадзена тэме станаўлення БДУ ў перыяд з 1918-га да 1939 года. А затым экскурсантам трэба будзе вырашыць шэраг галаваломак, звязаных з гісторыяй БДУ і біяграфіяй асветнікаў. Праводзіць экскурсіі даверана студэнтам-валанцёрам, сябрам «Клуба экскурсаводаў БДУ «IN VIA». Такая практыка дапаможа ім у далейшым пры атэстацыі гідамі і экскурсаводамі.

Наведаць экскурсію можна бясплатна, папярэдне патэлефанаваўшы на кафедру этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта па тэл. (+375) 17 222 35 81.




*Чытанне для сябе*

# Паспрачацца... з будучым класікам

**Стартаваў другі сезон праекта для вучняў сярэдніх і старшых класаў школ «Чытаў Q&A». Ён аб кнігах і пісьменніках, якія пакуль не ўвайшлі ў школьную праграму, аб літаратуры, якая ствараецца ў нас на вачах. Яе аўтары жывуць тут і цяпер, ходзяць разам з намі па адных вуліцах, чытаюць тыя ж навіны, глядзяць тыя ж фільмы. Менавіта па іх творах нашчадкі будуць меркаваць пра наш час і пра нас. З гэтымі пісьменнікамі можна сустрэцца, задаць ім пытанні і, галоўнае, — паспрачацца.**

Прычым пытанні можна задаваць самыя розныя: ад простых «Навошта вы гэта напісалі?», «А ці будзе працяг?» да тых, што звычайна саромеюцца задаць: «А гэты герой, ён жа зусім «цю-цю», навошта вы так з ім?» і «Мы зусім не такія, як у вашых кнігах!». А яшчэ праект разлічаны на чытанне не па абавязковай праграме, а для сябе, толькі для сябе. Яго арганізатарам выступае кніжны фестываль «Горад і кнігі» — штогадовая маштабная кніжная падзея сталіцы, арганізаваная сіламі валанцёраў, улюбёных у чытанне. За чатыры гады існавання фестывалю на ім прайшло больш за 400 кніжных і літаратурных мерапрыемстваў, якія наведала больш за 19 тысяч чалавек.

У другім сезоне праекта «Чытаў Q&A» для ўдзельнікаў падрыхтаваны цікавыя сюрпрызы. Запрошаны аўтар — Лілія ІЛЬЮШЫНА з дэбютнай кнігай «Ключ Дарог» на беларускай мове. Удзельнікі праекта змогуць першымі прачытаць гэты твор яшчэ да яго выхаду ў свет.

Другі сюрпрыз — чытанне кнігі праз мабільны месенджар Telegram. Усе ўдзельнікі атрымліваюць доступ да сакрэтнага чата. У яго з пэўнай перыядычнасцю арганізатары будуць адпраўляць часткі кнігі так, каб усе паспелі прачытаць. Капіяванне тэксту забаронена. Колькасць, памер частак і перыядычнасць вызначаюцца галасаваннем.

Па заканчэнні ўдзельнікі праекта павінны будуць выканаць творчае заданне, каб атрымаць запрашэнне на сустрэчу з аўтарам кнігі. Лілія Ільюшына — беларуская пісьменніца, выкладчыца філасофіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, мадэратар падлеткавага фэнтэзі-клуба.

*Смачна есці!*

# Комплекс — два рублі, Wi-Fi — бясплатна

**Новая студэнцкая кавярня адкрылася напярэдадні новага года ў БДУ. Сучасны пункт грамадскага харчавання размясціўся ў корпусе Інстытута бізнесу БДУ па вуліцы Маскоўскай, 15а.**



Інтэр'ер кавярні выкананы ў самых смелых дызайнерскіх рашэннях з разнастайнасцю каляровай гамы. Эфектыўнае выкарыстанне прасторы дазволіла стварыць 40 пасадачных месцаў. Акрамя таго, для арганізацыі хуткага харчавання ў зале прадугледжана спецыяльная стойка. Вытворчы цэх аснашчаны новым абсталяваннем і вентыляцыяй.

Комплексны абед будзе каштаваць студэнтам каля двух рублёў. У меню ўключаны таксама стравы на выбар. Акрамя таго, наведвальнікам прапануюць новую паслугу «ежа навынас». Набор дапоўніць гарачы напой у спецыяльным посудзе.

Кавярня будзе радаваць выпечкай уласнай вытворчасці. У асартымент мучных вырабаў увойдуць свежыя слойкі, булкі, кексы і піроныя. Лінейку прадукцыі рэгулярна плануюць пашыраць новымі прысмакамі.

У хуткім часе ў кавярні з'явіцца Wi-Fi і тэлевізар.

# Студэнцкі абед са зніжкай

**У БДУ плануецца ўвесці сацыяльныя цэны на харчаванне для студэнтаў. Гэта стане магчымым дзякуючы ўкараненню ў сетку ўніверсітэцкіх сталовых, буфетаў і кавярняў апаратна-праграмнага комплексу (АПК) «Харчаванне», які з'яўляецца інтэлектуальнай уласнасцю БДУ.**

Сёння сетку грамадскага харчавання Белдзяржуніверсітэта наведвае вялікая колькасць людзей. АПК дазволіць ідэнтыфікаваць студэнтаў БДУ, прааналізаваць іх смакавыя схільнасці, выбар страў, іх кошт, а таксама «пік» наведвальнасці пунктаў харчавання ў ВНУ. Атрыманыя звесткі будуць улічвацца пры фарміраванні меню і спрыяць паляпшэнню якасці паслуг пунктаў харчавання БДУ.

Сёння аўтаматызаваныя комплексы ўстаноўлены ў дзвюх кавярнях і сталовай галоўнага корпуса БДУ. У хуткім часе сістэмай абсталююць усе 23 пункты харчавання ўніверсітэта. На другім этапе патрабуецца дапрацоўка нарматыўна-прававой базы, што ў перспектыве дасць магчымасць распрацаваць зніжкавую сістэму на абедзеннае меню для студэнтаў БДУ.

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Надзея НІКАЛАЕВА і Сяргей РАСОЛЬКА.

*Ідэі маладых*

# РОБАТ — НАЙЛЕПШЫ СЯБРА ФІЗІКІ

**Так расшыфроўваецца назва мабільнай праграмы «RiBFoP» для вывучэння гэтага прадмета пры дапамозе аўтаматычнага ўстройства. Праект прыдумаў не вучоны, а дзесяцікласнік слуцкай сярэдняй школы № 11 Цімафей СТАМБРОЎСКІ. З ім ён перамог у раённай школьнай канферэнцыі, а потым стаў першым у фінале III Рэспубліканскага конкурсу маладзёжных праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу».**



Ідэйная «лямпачка» ў яго галаве загарэлася акурат на ўроку фізікі. «На дошцы былі начэрчаны квадрацікі, — распавядае вынаходнік. — Яны азначалі цела, якое рухаецца раўнамерна і прамалінейна. Я падумаў: было б здорава, калі б замест іх былі нашы робаты! Вучні ж так любяць візуалізаваць...»

Праграмаваць тэхніку Ціма навучыўся ў школьным гуртку па інтарэсах. А ажыццявіць прыдуманае дапамог яго настаўнік фізікі Дзмітрый Чарноў.

Пасля раённай канферэнцыі Ціма фей зразумеў, што праект патрэбны школам. Таму і стварыў мабільную праграму ў сістэме Android. Яна заклікана дапамагчы настаўнікам тлумачыць фізічныя законы, а школьнікам — іх разумець. З ёй вучань выйшаў у фінал Рэспубліканскага конкурсу «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу», які праводзілі Міністэрства адукацыі і кампанія МТС.

— Самае лёгкае, што можа паказваць робат, — траекторыю, — абараняе праект хлопец. — Настаўнік запускае яго, а той рухаецца ўперад і назад. Падчас дэманстрацыі ў вучняў можна спытаць: ці заўсёды траекторыяй з'яўляецца прамая лінія? Канешне, не! І тады запускаюць астатнія варыянты шляхоў. А яшчэ робат можа бачыць перашкоду і аб'язджаць яе, маляваць крэйдай на падлозе ці іншай плоскасці, па якой ездзіць...

Фінал праходзіў цягам трох дзён. Напружанне зашкальвала.

— Гэта быў самы маштабны конкурс, у якім я ўдзельнічаў! — дзеліцца ўражаннямі Цімафей. — А канкурэнты якія дастойныя! Больш за ўсё спадабаўся праект Ільі Архіпава, які заняў другое месца, — мабільная праграма, што паскарае працэс чытання ў чатыры разы. Зараз ужо многія чытаюць усё на тэлефоне, так што праграма карысная.

Пасля конкурсу, у якім, дарэчы, Цімафей стаў абсалютным пераможцам, вынаходніцтвам слуцкага школьніка зацікавіліся ў педагагічным універсітэце і запрасілі прадэманстраваць яго выкладчыкам кафедры інфарматыкі і методыкі выкладання інфарматыкі. Першы ўрок з выкарыстаннем робата правялі і ў роднай школе Цімафея. Вучням спадабалася. А выкладчык заўважыў, што яны пачалі лепш разбірацца ў тэме. Да таго ж пры дэманстрацыі робата ў школьнікаў — толькі пазітыўныя эмоцыі. А з іх дапамогай інфармацыя запамінаецца лепш.

...Ціма захапляецца настольным тэнісам і шахматамі, летась асвоіў гітару. Аднак вольнага часу на цікавыя заняткі цяпер стала прыкметна менш: усе сілы скіраваны на робатаў. Ужо пачалі з'яўляцца новыя ідэі для далейшага развіцця праекта...

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Бачыць мэту*

## Як малады педагог знаходзіць агульную мову з вучнямі

# Дзеці, sprechen ihr Deutsch?!

**Гісторыя Кацярыны ЯРМОЛЕНКІ як выкладчыцы пачалася ў гімназіі гарпасёлка Акцябрскі, што на Гомельшчыне, калі настаўніца нямецкай мовы запрыкмеціла добрыя здольнасці да яе ў маленькай дзяўчынкі. Цікава, што матуля, цётка і бабуля Каці па прафесіі таксама педагогі. Яны не сумняваліся: гены сваё возьмуць.**

— Калі ў 11 класе надышоў час вызначацца з будучай прафесіяй, зразумела, што хачу звязаць сваё жыццё з нямецкай мовай. Многія мяне адгаворвалі: «Ты што, будзеш настаўніцай? Навошта табе гэта трэба?» Але я была непахісная. Ведаеце, у маім дзяцінстве многія вялі дзённікі, запаўнялі розныя анкеты. Аднойчы знайшла ў сябе дома адзін з такіх экзэмпляраў, дзе было напісана: «Я люблю нямецкую мову!», «Хачу стаць перакладчыцай!». Цудоўна, што мары спраўджваюцца! — прагаўе суразмоўніца.

У апошні дзень падачы дакументаў дзяўчына паехала ў абласны цэнтр і паступіла ў Гомельскі ўніверсітэт імя Францыска Скарыны на аддзяленне замежных моў. Пасля вучобы трэба было адпрацаваць два гады ў сельскай школе.

— Гэтага я не баялася. Паехала ў вёску Рассвет роднага Акцябрскага раёна. У класах вучылася па шэсць—дзесяць дзяцей. Былі выпадкі, калі на ўрок прыходзіў толькі адзін вучань, — гаворыць Кацярына.



Маладая настаўніца паспявала рабіць усё: і цікавыя ўрокі праводзіць, і ў сталіцу ездзіць адпачываць. Акрамя асноўных абавязкаў у сельскай школе некалькі разоў яе запрашалі ў Германію — у якасці перакладчыцы з групай дзяцей. Прызнаецца, што гэта была выдатная практыка. У вёсцы Кацярыне падабалася, але хацелася большага. Адпрацаваўшы два гады, дзяўчына знайшла месца ў Мінску.

— Чым выкладанне мовы ў сталічнай школе адрозніваецца ад выкладання ў сельскай? У горадзе шмат паралельных класаў, іх колькасць даходзіць да шасці-сямі, — кажа суразмоўніца. — А яшчэ, як толькі прыйшла ў гэтую школу, для мяне пачаліся разнастайныя конкурсы. Адным з такіх стаў «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі», дзе я заняла другое месца. Раней прымала ўдзел у «Настаўніку года», але на мясцовым узроўні, дзе стала першай. Шчыра кажучы, удзел у конкурсе аднімае шмат часу і сіл, бо этапы праходзяць амаль увесь навучальны год: адкрытыя ўрокі ў іншых школах, выступленні на сцэне, пастаноўкі, стварэнне відэаролікаў. Неспадзявана для сябе я заняла другое месца на ўзроўні Мінска!

Настаўніца прызнаецца, што не спыняецца вучыцца. Курсы па ўдасканаленні прафесійных ведаў і парады калег дапамагаюць развіццю, а адкрытыя ўрокі выяўляюць маленькія недахопы, якія Кацярына можа адразу выправіць.

— Люблю сваю работу, бо яна не сумная, а творчая — заўсёды трэба штосьці прыдумляць на ўрок, каб вучням падабалася. Напрыклад, летась разам з маімі «школьнымі дзецьмі» ўдзельнічалі ў замежным праекце. Думала, якую ж тэму выбраць. Спыніліся на ежы: разам гатавалі дранікі, здымалі гэта на камеру, размаўлялі падчас дзеяння па-нямецку. Як вынік — станоўчыя эмоцыі і дыплом у руках, — кажа Кацярына. — Я не тыповая строгая настаўніца, якая працуе толькі па плане. Люблю эксперыментаваць з метадамі, здзіўляць. Напрыклад, заходжу ў краму, бачу нейкія мячыкі, літары, думаю: «О, гэта мне спатрэбіцца на занятках!» Весялосці ў нас таксама хапае! Напрыклад, вяду ўрок, вельмі сканцэнтраваная, усе слухаюць. Я тлумачу правілы, і тут адзін хлопчык цягне руку і кажа: «А ў майго брата ўчора быў дзень нараджэння!» Ну як тут усё нармальна весці ўрок? Трэба ж выслухаць! Або нядаўна вучань нясе дзённік і кажа: «Кацярына Міхайлаўна, я не зрабіў хатняе заданне, пастаўце два». А я яму адказваю: «Двойку таксама трэба заслужыць, так што ў цябе ёсць час. Ідзі, рыхтуйся, зараз буду пытацца». Я адчуваю, што выкладаю нямецкую мову не дарма, што гэта прыносіць карысць тым, хто імкнецца да вучобы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# РЫНГ І ПОДЫУМ ДЛЯ... ВЕТУРАЧА...



Студэнцкія гады.

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

— Студэнты заўсёды пытаюцца: «Як вас сюды занесла?» — усміхаецца Юлія. — Я, канешне, хачу пажартаваць, што і яны могуць сюды вярнуцца, але звычайна тлумачу: «У мяне адпрацоўка пасля акадэміі. Выбрала любімы каледж з цудоўнымі выкладчыкамі. Цяпер і я хачу пакінуць пра ўстанову ў іншых такія ж цёплыя ўспаміны, якія дагэтуль жывуць у маім сэрцы». Мне здаецца, кантакт са студэнтамі наладжаны. Дзесьці магу быць строгай, дзесьці пасмяяцца, пажартаваць. Разумею, што яны дарослыя, таму стаўлюся да іх адпаведна. Як і ўсе выкладчыкі, патрабую ведання прадмета, тлумачу незразумелае... Я люблю самаўдасканальвацца. І прафесія ў гэтым дапамагае. Разам са студэнтамі многае вучу нанова. Да таго ж маё маўленне стала нашмат лепшае, ужо няма ранейшага хвалявання ў голасе.

Паміж лекцыямі і семінарамі, падрыхтоўкай да заняткаў Юлія знайшла час для ўдзелу ў конкурсе «Міс Беларусь — 2018». Спачатку было 750 дзяўчат, потым засталося 250, 150... яшчэ менш, а Юлія Кузьменка ўсё яшчэ трымалася сярод прэтэндэнтак.

— Калі на сайце конкурсу нарэшце змясцілі спіс усіх, хто прайшоў, то, убачыўшы сваё прозвішча, я скакала і крычала ад радасці! — успамінае Юлія. — Але потым мне сказалі: «Ну, вы крыху паўнаватая»... Быў тыдзень жорсткіх трэніровак, дыет, слёз. Пачалася істэрыка. У выніку я пахудзела на чатыры з паловай кілаграмы. Але так рабіць нікому не раю. Проста ў мяне была мэта, і я да яе ішла. Бо заўсёды было крыўдна, што прадстаўляю Беларусь на міжнародных конкурсах, а ў нацыянальным так і не ўдзельнічала. Дзеля конкурсу я нават раней прыляцела з Маямі. Сказалі: «Або прыязджаеце, або выкрэсліваем вас». Давялося мяняць дарагія білеты, скарачаць час адпачынку. Але гэта і няважна: я атрымала тое, аб чым марыла...

Да ўсяго Юлія — яшчэ і мадэль. Яна ўдзельнічала ў паказах на Belarus Fashion Week, маскоўскім Тыдні моды, ездзіла на здымкі ў Мілан, Парыж, Барселону...

Раніцай у каледжы яна — Юлія Леанідаўна, увечары — проста Юля з Ice Girls на рэпетыцыях і хатніх хакейных матчах мінскага «Дынама». Падрыхтоўка да заняткаў пачынаецца бліжэй да гадзіны ночы. Таму спаць па пяць гадзін — звыклая справа. Калісьці ў шчыльным графіку быў і бокс. Гэты спорт, па словах Юліі, ідэальны для таго, каб даць волю эмоцыям, атрымаць загартоўку. Зараз часу не хапае, хоць ёй вельмі хочацца вярнуцца на рынг...

— Мой дэвіз па жыцці: усё, што ні робіцца, — робіцца да лепшага, — кажа дзяўчына. — Нельга «заганяцца» з-за дробязяў. А самае галоўнае — трэба быць заўсёды ўпэўненай у сабе. І тады ўсё атрымаецца.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

Мазаіка поспеху

# «КАСМІЧНЫЯ КАПКЕЙКІ»,

## ці Галоўнае — не баяцца эксперыментаваць!



**— Табе не здаецца, што гэты занятак больш падыходзіць дзяўчынкам? — часта пытаюцца сябры і знаёмыя ў дзевяцікласніка з Маладзечна Глеба РУДЗЬКО. У адказ на гэта хлопец заўсёды даводзіць, што самыя знакамітыя кандытары свету — мужчыны. Як гаварыў яго кумір Рэнат Акзамаў, чэмпіён Расіі па кандытарскім мастацтве: «Чалавек увесь час павінен вучыцца, пры падрыхтоўцы дэсертаў не важныя пол, нацыянальнасць ці ўзрост. Галоўнае — гэта веды і любоў да таго, што ты робіш».**

...Аднойчы ў сястры Глеба была гадавіна вяселля. Мама вырашыла зрабіць торт з масцікай і папрасіла сына дапамагчы ёй. Калі ён убачыў вынік іх працы і пачуў захопленыя водгукі гасцей, захацелася зрабіць нешта падобнае зноў. Стаў шукаць у інтэрнэце розныя рэцэпты не толькі тартоў, але і іншых дэсертаў.

**Кулінарыя — галоўнае, але не адзінае хобі маладога чалавека.**

У партфоліа юнака ў Instagram каля 30 найлепшых «твораў» кулінарнага мастацтва. Уражвае яркі і арыгінальны дызайн тартоў, убачыўшы якія, нельга не здзівіцца фантазіі і крэатыўнасці хлопца. Напрыклад, яго любімы торт «Чырвоны аксаміт», нягледзячы на свой незвычайны колер, зроблены з натуральных прадуктаў, яго тэкстура нагадвае аксаміт, а сметанковы крэм падкрэслівае смак. «Лайкамі» і каментарыямі асабліва адзначаны «Касмічныя капкейкі» — невялікія пірожныя-кексы, названыя так з-за спалучэння сініх і фіялетавых колераў крэмавай шапачкі. З задавальненнем Глеб робіць трайфл — дэсерт з бісквітнага цеста з крэмам у шклянцы, безэ мерэнга на палачцы. Рыхтуе начынні ў тарты — кампатэ, канфіцюр, розныя крэмы. А ў люстраной глазуры, якой ён пакрывае ідэальна роўныя вырабы, можна і сапраўды ўбачыць сваё адлюстраванне. У планах — навучыцца гатаваць двух'ярусныя кулінарныя шэдэўры.

— Самае галоўнае ў гэтай справе — не баяцца эксперыментаваць, — лічыць Глеб. — Калі ты бачыш, што рэцэпт складаны, то не варта апускаць рукі, і, у рэшце рэшт, усё павінна атрымацца. Калі рабіў французскія пірожныя «Макарон», паспрабаваў пяць розных рэцэптаў, пакуль не знайшоў «свой». Калі часам нешта не атрымліваецца, хочацца выкінуць усё з акна. Гэта вельмі карпатлівая праца...














Прыкладам для юнака стаў французскі кандытар П'ер Эрмэ, стваральнік класічнага дэсерту — торта «Опера». Ён быў наватарам шмат у чым: адкрыў сетку высакакласных пякарняў у Парыжы, пякарню-кавярню-бістро ў першым французскім гандлёвым цэнтры, прафесійную французскую школу перападрыхтоўкі шэф-кухараў, лінію замарожаных дэсертаў. Раўняючыся на яго, Глеб плануе паступіць у інстытут харчовай прамысловасці, а пасля заканчэння марыць адкрыць сваю кавярню.

Юны кандытар вельмі любіць салодкае і не паважае фаст-фуд. Але калі б прыйшлося выбраць усяго адзін прадукт, які можна было б есці да канца жыцця, то выбраў бы мяса. Сапраўдны мужчына!

Кулінарыя — галоўнае, але не адзінае хобі маладога чалавека. У яго жыцці ёсць месца вакалу і танцам. Ад бацькі хлопцу перадалася любоў да музыкі, і ў школе Глеб спявае ў вакальнай групе «Красавік». Раней займаўся тайскім боксам і айкідо, але з-за траўмы давялося сысці з секцыі.

— Спорт замянілі танцы. Гэта і дадатковая фізічная нагрузка, і станоўчыя эмоцыі, — тлумачыць юнак. — Яшчэ я захапіўся журналістыкай. Сястра мае такую прафесію, яна дапамагае ў маіх пачынаннях, выпраўляе недахопы і дае парады.

Амаль кожныя выхадныя хлопец — актыўны ўдзельнік розных мерапрыемстваў: «Дзе логіка?», «Брэйн-рынг», «Запалі вогнішча дабра»... Яму падабаецца наведваць школьныя рэпетыцыі, пісаць сцэнарыі, быць вядучым, рыхтавацца да конкурсаў.

— Імкнуся рабіць усё ідэальна, каб перамагчы, — прызнаецца юнак.

Вясёлы, лёгкі на пад'ём Глеб без цяжкасцяў прыдумвае жарты для каманды КВЗ, якая паспяхова выступае на раённых і абласных турнірах. Пазалетась хлопец з аднакласнікамі падтрымліваў педагога-арганізатара Вольгу Шавель у конкурсе «Суперважаты», якая на рэспубліканскім этапе заняла трэцяе месца.

Глеб — актывіст піянерскай арганізацыі і БРСМ, атрада «Добрае Сэрца». Запомнілася, як удзельнічаў у забегу «Velcom — бягом»: «Удзельнікі дабрачыннай акцыі ўстанавілі на тэлефоны праграмы, і яны счытвалі кіламетры, якія мы прабеглі. За кожны кіламетр налічаўся рубель, а ўсе сродкі пералічваліся ў фонд дзіцячага дома. Я адолеў 4,5 кіламетра. Хай невялікі, але мой асабісты ўклад у агульную добрую справу».

**Глеб плануе паступіць у інстытут харчовай прамысловасці, а пасля заканчэння марыць адкрыць сваю кавярню.**

Аднойчы яму прапанавалі паехаць ад атрада юных пажарных-ратавальнікаў у палявы лагер.

— Тры дні мы жылі ў палатках, дзяжурылі каля вогнішча, каталіся на маторнай лодцы, удзельнічалі ў эстафеце, — успамінае хлопец. — Калі здарыцца экстранная сітуацыя, я ведаю, як трэба дзейнічаць, і змагу аказаць першую дапамогу.

Штогод у канцы навучальнага года ў маладзечанскай СШ № 14 праходзіць мерапрыемства «Мазаіка поспеху», на якім узнагароджваюць найлепшых вучняў па выніках года: выдатнікаў, спартсменаў, таленты. Два гады запар Глеб Рудзько атрымлівае статуэтку як самы таленавіты і актыўны вучань.

Яго любімая пара года — лета. Адпачынак, дапамога бабулі па гаспадарцы, летнік, прырода, свежае паветра, новыя сябры... І самае галоўнае — дзень нараджэння. Хлопец заўсёды прадумвае свята да дробязяў. Летась была касцюміраваная вечарынка ў стылі «Галівуд».

Па жыцці Глеб аптыміст: «Я разумею, што адна няўдача нічога не вырашае. Усё роўна трэба рухацца далей».

**Надзея БОБРЫК,**
**студэнтка І курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ.**

Камертон настрою

# Прыпынак — вёска Асавая

## Дзе прайшло дзяцінства, там і пачынаецца радзіма

**...На гадзінніку 16.00 — самы час збіраць рэчы і адпраўляцца ў дарогу. Галоўнае — білет не забыць і на цягнік не спазніцца. Даўно я ўжо не была на сваёй малой радзіме — у вёсцы Асавой, што ў Столінскім раёне. Менавіта там я правяла ўсё дзяцінства. Ужо ўяўляю, як на станцыі Відзібор мяне сустрэнуць радасныя бабуля з дзядулем. Як заўсёды, мой вагон будзе далёка ад іх машыны і мне прыйдзецца бегчы з усіх ног насустрач бабулі Валі. Не паверыце, але яна таксама бяжыць да мяне, не хутка, але бяжыць. «Так, Кацярына, заканчвай марыць, а то табе прыйдзецца бегчы за цягніком», — падумала я.**

Праз 20 хвілін паказаўся вакзал. Тут нават пах нейкі асаблівы, ён нібы дае зразумець, што ўсё будзе добра. А колькі людзей! Усе спяшаюцца, хвалююцца. На вочы трапляюць фіялетавыя цюльпаны — любімыя кветкі бабулі. Не трацячы часу, купляю вялізны букет. На табло шукаю назву свайго цягніка — «Магілёў — Трускавец». Дабіраюся да яго, займаю месца ва ўтульным купэ. Цягнік адпраўляецца, а я, такім чынам, уцякаю ад гарадской мітусні. Падарожжа працягваецца пяць гадзін. За гэты час можна шмат чаго зрабіць: паглядзець у акенца, паспаць, пачытаць кнігу, канешне, калі не забылася пакласці яе ў сумку. У канцы дарогі асабліва ўважліва сачу за тым, што адбываецца за акном. Усюды цёмна, але, як толькі цягнік трапляе на мост, можна ўбачыць Прыпяць, асветленую ліхтарыкамі.

...Я амаль прыехала: наступная станцыя — Відзібор. Якое тут прыгожае неба: мільён зорак, нібы жамчужынкі! Як я і гаварыла, бабуля бяжыць насустрач. Гаворыць пра мяне: «Падарунак з Мінска прыехаў». І — усміхаецца. Букет цюльпанаў у яе руках. А цяпер хутчэй садзімся ў машыну — родныя мясціны чакаюць! Пасля Відзібора мы праязджаем вёску Церабішча, потым — Відзібораць. А вось і Асавая. Насупраць нашай хаты стаіць старая вярба, яна мяне таксама сустракае-вітае. Адкрываю нашу брамку, што рыпіць неяк па-асабліваму. Далей — сабака, які па-сяброўску віляе хвастом, падскоквае. Здаецца, яшчэ ўчора гуляла тут у хованкі, даганялкі, купалася ў дзіцячым басейне, а зараз на двары ціха... Так, з гэтым месцам у мяне шмат чаго звязана. У Асавой я навучылася хадзіць, катацца на веласіпедзе, з дапамогай бабулі — лічыць грошы, не баяцца працы (агарод прапалоць, памідоры падвязаць, ураджай сабраць). Тут я знайшла сапраўдных сяброў, першае каханне...

Для кожнага чалавека радзіма — самае дарагое. Менавіта там кожны з нас атрымлівае моц, энергію, спакой.

...Надышоў час збіраць сумку і развітвацца з палескімі прасторамі, цёплым надвор'ем, бабулінымі блінамі, якія яна з любоўю гатавала кожную раніцу, небам з зорамі-жамчужынамі. Толькі тут такое неба. Галоўнае — білет не забыць і на цягнік не спазніцца. Мінск зачакаўся... Ужо не так радасна я «лячу» на станцыю Відзібор. У купэ гляджу ў акенца, там мае бабуля і дзядуля, усміхаюцца, махаюць не развітанне. Цягнік «Магілёў — Трускавец» адпраўляецца, і я вяртаюся ў гарадскую мітусню. І ўжо з нецярпеннем чакаю новай сустрэчы! Уяўляю, як зноў буду шукаць на табло назву свайго цягніка, які прывязе мяне сюды, у маё дзяцінства. Да сустрэчы, мая Асавая! Прыеду на наступныя канікулы яшчэ, абяцаю!

**Кацярына ЯРАШЭВІЧ,**
**студэнтка І курса факультэта журналістыкі БДУ.**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «Юридическая компания «Приоритет», 211405, г. Полоцк, пер. Калиновского, д. 28, пом. 2 |
| **Продавец** | ТПУП «Торговый дом «Коптево», г. Новополоцк, пер. Рижский, 10 |

**Предмет аукциона: складская база** в составе: **арочный склад № 1** (701,6 кв. м, инв. № 252/С-3602), **арочный склад № 2** (701,8 кв. м, инв. № 252/С-8822), **резервуары пожарного запаса № 2** (инв. № 252/С-21147) и **№ 3 (**инв. № 252/С-21148) по 75 куб. м. **(Витебская обл., г. Новополоцк, пер. Рижский, д. 10 (корп. 4, 5)**

**Сведения о земельном участке**: предоставлен Продавцу, общ. пл. **0,6851** га, на праве постоянного пользования для обслуживания зданий арочных складов и резервуаров пожарного запаса. Ограничения – водоохранная зона рек и водоемов.

**В СЭЗ «Витебска» согл. Указу Президента Республики Беларусь от 22.08.2018 № 346**

**Начальная цена с НДС 20 % – 62 000,00 руб. Шаг аукциона – 3100,00 руб.**

Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется: вторник–четверг с 09.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00.
Ответственное лицо: Михайлов С. В., тел. +375 29 2314901

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона не позднее 21.01.2019 перечисляется на р/с BY39ALFA30122369400010270000 (BYN) в ЗАО «Альфа-Банк» г. Минск, BIC ALFABY2X. Получатель платежа – ООО «Юридическая компания «Приоритет», УНП 391609018

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** 30 % от стоимости предмета торгов – не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, остальная сумма – не позднее 6 месяцев со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утв. пост. СМ РБ от 08.01.2013 № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

**В случае признания торгов несостоявшимися** в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %. **Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов

**Аукцион состоится:** 22.01.2019 в 11.00 по месту нахождения продавца торгов.

**Дата и время начала и окончания приема документов:** с 11.01.2019 с 09.00 по 21.01.2019 до 17.00 по указанному адресу организатора торгов.

**E-mail: yur_k_prioritet@mail.ru. Тел. +375 29 2314901.**

Подробная информация размещена в газетах «Рэспубліка» от 17.07.2018, 05.10.2018, 26.10.2018, «Звязда» от 25.08.2018, 07.09.2018, «Новополоцк Сегодня» от 05.10.2018, 26.10.2018

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24 |

**Предмет аукциона**
**Местоположение – Минская обл., Минский р-н**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (населенный пункт) |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин № 34** (здание специализир. рознич. торговли) | 285,6 кв. м | 600/С-55531 | Колодищанский с/с, д. Юхновка |
| Составные части и принадлежности: сарай, уборная | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0903** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли | | | |
| **Обременения:** аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 199 200,00 бел. руб.** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание склада** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ) | 450,4 кв. м | 600/С-161152 | г. Заславль, ул. Советская, 134 |
| Составные части и принадлежности: крыльцо, сарай | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,6104** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов иного назначения. Обременения: водоохранная зона, охранные зоны электрических сетей (до 1000 В), пл. 0,0327 га | | | |
| **Обременения:** аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 391 000,00 бел. руб.** (снижена на 10 %) | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Магазин** (здание специализир. рознич. торговли) | 47,6 кв. м | 600/С-137949 | Боровлянский с/с, д. Слободщина |
| Составные части и принадлежности: крыльцо, сарай | | | |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0129** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 33 900,00 бел. руб.** (снижена на 30 %) | | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 4 опубликовано в газете «Звязда» 15.11.2018

**Аукцион состоится 24.01.2019** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 22.01.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

---

**Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительными:** полис ОСГО ВТС на территории государств – членов системы «Зеленая карта» серии BY/07 № 14160035. Страховое свидетельство ОСГО ВТС на территории РБ серии ВВ № 6474115.

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Дзержинский райагросервис» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания Старинковского сельского исполнительного комитета (в состав здания входят сарай и уборная), общей площадью 217,2 кв. м, инв. № 620/С-23639, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622280409801000156 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью 0,2750 га, по адресу: Минская область, Дзержинский район, Боровской с/с, д. Старинки.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона водных объектов (0,2750 га).*

**Условия продажи:**

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

Начальная цена с НДС – **44 101,20** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **4 410,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2018. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **30.01.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.01.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже производственной базы в г. Сморгони, принадлежащей ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ»

**Лот № 1, состав лота:** 1. Здания и сооружения: 1.1. Административно-бытовой корпус с инв. № 443/С-18244. Площадь – 2936 кв. м. 1.2. Производственный корпус с инв. № 443/С-18245. Площадь – 1332 кв. м. 1.3. Эстакада и площадка для мойки машин с инв. № 443/С-19449. Площадь застройки – 101 кв. м. 1.4. Склад для хранения оцинкованного железа, листового алюминия, спецодежды с инв. № 443/С-19450. Площадь – 601,3 кв. м. 1.5. Очистные сооружения с инв. № 443/С-19451. Площадь застройки – 31 кв. м. 1.6. Склад баллонов с инв. № 443/С-19452. Площадь – 73,6 кв. м. 1.7. Групповые очистные сооружения с инв. № 443/С-19453. Площадь застройки – 330 кв. м. 1.8. Складской корпус с инв. № 443/С-19454. Площадь – 2917,1 кв. м. 1.9. Площадка козлового крана с инв. № 443/С-19498. Общая площадь – 6608 кв. м. 1.10. Ограждение, проезды и площадки базы с инв. № 443/С-19499. Площадь – 10579 кв. м. 1.11. Открытая стоянка машин с инв. № 443/С-19500. Площадь – 4828 кв. м. 1.12. Стоянка личного автотранспорта с инв. № 443/С-19503. Площадь – 987 кв. м. 1.13. Контрольно-пропускной пункт с инв. № 443/С-19504. Площадь – 207,3 кв. м. 2. Иное имущество, подлежащее демонтажу. 3. Оборудование. 4. Кран козловой с инв. № 177. Полный перечень иного имущества, подлежащего демонтажу, и оборудования приведен на сайте Организатора аукциона ino.by. Адрес продаваемого имущества: Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 13. **Начальная цена – 600 000,00 бел. руб. с НДС. Задаток – 60 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %**

**Обременения:** часть площадей сдается в аренду. Полная информация о сдаваемых площадях приведена на сайте Организатора аукциона ino.by

**Земельный участок** площадью ***5,3389 га*** с кадастровым номером ***425650100001004200***. Право постоянного пользования. Переход права осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Лота № 1 в течение 15 (пятнадцати) банковских дней с момента подписания договора купли-продажи.
3. Демонтаж имущества осуществляет Победитель аукциона (Претендент на покупку).
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 2 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
5. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 12.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ», 220021, г. Минск, пер. Бехтерева, д.12. тел. 8 (017) 291-32-79.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества (Лот № 1), принадлежащего ОАО «БЕЛТЕПЛОИЗОЛЯЦИЯ», проводимом 12.02.2019 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 08.02.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Федоринчик Владимир, тел. 8 (029) 665-75-47

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «В ГОСТЯХ У DILMAH»

Наименование рекламной игры: **«В гостях у Dilmah»**.
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 1 октября 2018 г. по 25 января 2019 г.
В рекламной игре приняли участие 1 248 человек.
Призовой фонд игры разыгран полностью.

Обладателями Главного приза: сертификат на поездку на Шри-Ланку на 2 человек на 6 ночей (включающий услуги по авиаперелету: Минск – Стамбул – Коломбо – Стамбул – Минск; отель по программе тура, полупансион, переезды: Аэропорт (Коломбо) – Коломбо – Канди–Нувара Элия – Берувела – Коломбо – Аэропорт (Коломбо).

Дополнительные услуги: экскурсии по программе тура: Канди, Нувара Элия, Коломбо сити-тур, виза/визовая поддержка (визовый сбор оплачивается по прилету дополнительно в стране пребывания), оформление страховки/мед. страховка, услуги гида/русскоговорящий гид; период предоставления тура: 13.03.19 – 20.03.19) + Денежные средства в размере 1 324,06 белорусского рубля стали:

1. Карасева Марина Михайловна, г. Минск;
2. Мухина Татьяна Николаевна, г. Минск.

Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Агентство Маркетинговых Коммуникаций «РЭПКА», УНП 191728827, Республика Беларусь, г. Минск, 220073, ул. Ольшевского, д. 20/11, оф. 21.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3380 от 10.09.2018 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 44 726 90 08.

---

## ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона по продаже объекта ОАО «Белорусский цементный завод»

**Лот № 1.** Комбайн КЗС-7-25 гар. № 1552, 2005 г. в., расположенный по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117. Начальная цена продажи – **15 960 рублей,** в т. ч. НДС – 2 660 рублей. Задаток для участия в аукционе составляет 10 % или 1 596 рублей.

Извещение о предыдущем несостоявшемся аукционе по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 24.08.2018 г. № 162.

Аукцион состоится **21.01.2019 г. в 14.00** по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 18.01.2019 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 21.01.2019 с 12.00 до 13.45 по месту проведения аукциона.

Продавец: ОАО «Белорусский цементный завод», 213640, г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117. Организатор аукциона: ООО «БелИнвестОценка», 220108, г. Минск, ул. Казинца, 62, пом. 910.

Аукцион проводится в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь, Указом Президента Республики Беларусь от 5 мая 2009 г. № 232 (с изменениями и дополнениями) и Порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов. Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», BIC BPSBB2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с Открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи с 9.00 до 17.00. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8 (029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.

---

## ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже объекта открытым акционерным обществом «Белорусский цементный завод»

**Лот № 1.** Здание цеха деревообработки с инвентарным № 732/С-5301, площадью 498,7 кв. м, ограждение дощатое с инвентарным № 732/С-11107, бетонное, асфальтовое покрытие, бетонная дорожка с инвентарным № 732/С-11109, площадью 388 кв. м, находящихся по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Набережная, 32. Начальная цена продажи **38 541,57 рубля** с НДС. Задаток для участия в аукционе составляет 10 %, или 3 854,16 рубля.

Извещения о предыдущих несостоявшихся аукционах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 16.11.2018 г. № 221 и 21.12.2018 г. № 246.

Аукцион состоится **21.01.2019 г.** в **15.00** по адресу: Могилевская обл., г. Костюковичи, ул. Юношеская, 117.

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», BIC BPSBB2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 18.01.2019 г. включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 21.01.2019 г. с 12.00 до 13.45 по месту проведения аукциона. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-29-44, 8 (029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by и на сайте belinvo.by

---

## Уважаемые акционеры ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»! 24 января 2019 г. в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров с повесткой дня:

1. О выплате дивидендов.

Местонахождение ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Лещинская, 49.

Время регистрации в день проведения собрания с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера дополнительно – доверенность).

Дата сбора реестра – 16.01.2019.

Справки по телефону: 8 (0232) 441017.

С материалами к собранию можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 18.01.2019 (с 12.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

**Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг**

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», находящееся по адресу: Республика Беларусь, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, на основании решения наблюдательного совета от 08.01.2019 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату сбора реестра акционеров – 16 января 2019 года.

УНП 400078768

Вярнуцца да жыцця

# «НІЧОГА МНЕ НЕ ТРЭБА»



## Як гэта — лячыцца ад дэпрэсіі ў дваццаць

***«Добры дзень. Я Саша, і мне тэрмінова патрэбна дапамога», — з такімі словамі два гады таму звярнуўся ў гарадскі клінічны псіхіятрычны дыспансер Мінска наш герой.***

### СЛОВАМІ НЕ АПІСАЦЬ

Аляксандр нарадзіўся і вырас у невялікім прамысловым гарадку Гомельскай вобласці. Мама — інжынер, бацька — трэнер, а ён — адзінае дзіця ў сям'і.

— У мяне не было залежнасцяў ад алкаголю, наркотыкаў, камп'ютарных гульняў. Усё як ва ўсіх. Я быў звычайным школьнікам. Вучыўся сярэдне, тусаваўся з сябрамі. Праўда, яны пераважна былі малодшыя за мяне. З аднакласнікамі адносіны не клеіліся. Магчыма, таму, што я вельмі хацеў ім спадабацца, і гэта іх адштурхоўвала. А гадоў з 14—15 быццам зацыкліўся на ідэі стаць папулярным сярод равеснікаў. Не ведаю, адкуль узялося гэтае жаданне, але менавіта яно мною авалодала і падштурхнула да далейшых праблем з псіхікай, — кажа Саша.

**Маме пра сваю хваробу і яе пераадоленне Саша расказаў праз два месяцы пасля дыспансера. Бацька і цяпер пра гэта не ведае.**

Пасля школы хлопец паступіў у БДУ. Першым часам усё ішло нармальна: новы асяродак, людзі з падобнымі інтарэсамі, магчымасці вялікага горада. Адзінае, што крыху выбівала Сашу з раўнавагі, — здымная кватэра, дзе ён жыў.

— У адным пакоі — я, у другім — бабуля гадоў васьмідзесяці, якая любіла паказаць свой характар. Яна даймала мяне па вечарах, калі я вяртаўся. Да раздражнення з гэтай нагоды пачалі дадавацца перажыванні наконт адносін з аднагрупнікамі. Ну хто ў 17 гадоў не марыць быць крутым? У нейкі момант я перастаў кантраляваць свае жаданні і занадта ў іх паглыбіўся. Магчымасці дасягнуць задуманага я не бачыў. Гэта прыгнятала і выклікала стрэс. Пасля зімовай сесіі пачаў аддаляцца ад універсітэцкіх сяброў. Мне здавалася, калі я ізалююся ад усіх, гэта вырашыць мае праблемы. Атрымалася, вядома, наадварот. Цуд, што мяне за гэты час не адлічылі з універсітэта. Я мог хадзіць на заняткі, але амаль ніколі да іх не рыхтаваўся. Мог і не хадзіць тыднямі. Чаму? Гэта складана растлумачыць. Ты проста не бачыш сэнсу. Адсутнічае боязь, якая звычайна прымушае студэнтаў засесці за кніжкі. Выкладчыкі чамусьці мяне шкадавалі, хоць я ніколі не жаліўся і не выпрошваў адзнакі, — расказвае хлопец. — Ва ўніверсітэце ніхто не называў мяне псіхам-адзіночкай. Хоць менавіта ім я і быў. Месяцамі не размаўляў з аднагрупнікамі, а ім, здаецца, было ўсё роўна.

За вучобу і жыллё Сашы плаціў бацькі. Грошы на ежу і асабістыя патрэбы ён таксама браў у іх. Вядома, гэта былі невялікія сумы. Хлопец разумеў: трэба шукаць работу, і час ад часу нават спрабаваў гэта зрабіць, але нічога не атрымлівалася. Недахоп сілы волі і пастаянныя думкі аб тым, як яго ўспрымаюць іншыя, перашкаджалі наладжваць кантакты.

— Калі пачаць апісваць дэпрэсію словамі, то атрымаецца так: прыгнечанасць і меланхолія, уедлівыя трывожныя думкі пра мінулае і будучыню, невытлумачальная напружанасць і трывога. Пік сінтэзу гэтых пачуццяў — абыякавасць да ўсяго і ўсіх. Гэта немагчыма зразумець, пакуль сам не адчуеш. Хоць я нікому не жадаю праз гэта прайсці.

Па дапамогу да спецыялістаў Саша ўпершыню звярнуўся на трэцім курсе, калі пачаў адчуваць, што мазгавая актыўнасць рэзка пайшла на спад. Не мог цягам 15—20 хвілін чытаць, слухаць і нават думаць — увага пастаянна быццам рассейвалася. Да таго ж з'явіліся праблемы са сном.

— У студэнцкай паліклініцы пасля некалькіх класічных тэстаў на выяўленне праблем з псіхікай мне паставілі дыягназ — змешанае трывожна-дэпрэсіўнае расстройства. Прапанавалі лячэнне — стацыянар у псіхдыспансеры і платныя індывідуальныя сеансы з псіхолагам. Першы варыянт адпаў пасля таго, як я ўбачыў краты на вокнах будынка клінікі, куды мяне збіраліся адправіць. З псіхолагам справа таксама не заладзілася. Пасля аднаго наведвання я адчуў неверагодны прыліў энергіі, быццам гара апатыі і суму з плеч звалілася. Здавалася, што дэпрэсія адступіла, і я вырашыў да псіхолага больш не хадзіць.

**«Пік сінтэзу гэтых пачуццяў — абыякавасць да ўсяго і ўсіх. Гэта немагчыма зразумець, пакуль сам не адчуеш. Хоць я нікому не жадаю праз гэта прайсці».**

Сваё расстройства Саша параўноўвае з амерыканскімі горкамі. Бываюць уздымы энергіі, калі ты можаш вучыцца, займацца спортам, хадзіць куды-небудзь. Але пасля зноў апускаешся на самае дно адчаю і цікавасць да жыцця знікае. Для хлопца найцяжэйшым перыядам стала лета 2016 года. Ён павінен быў праходзіць практыку, але па факце цэлымі днямі знаходзіўся ў студэнцкім інтэрнаце. У пакоі, акрамя яго, нікога не было.

— Я адчуваў абсалютнае энергічнае спусташэнне, быццам згас агонь унутры. Фізічных сіл не хапала нават на элементарныя побытавыя рэчы. Я вельмі рэдка выходзіў у краму па прадукты і мог тыднямі не прымаць душ. Менавіта ў той момант з'явіліся думкі пра самазабойства, — успамінае Саша. — Бліжэй да восені, калі ў інтэрнат пачалі вяртацца іншыя студэнты, я крыху «ажыў». Нават пачаў займацца спортам, з'ездзіў у Вільнюс і нарэшце з'явіўся на практыцы. Здавалася, што ўсё ў чарговы раз наладзілася. Аднак стрэс падчас зімовай сесіі зноў адкінуў мяне на некалькі крокаў назад. Пасля экзаменаў суседзі ў інтэрнаце абмяркоўвалі дыпломныя работы, практыку і будучую работу. А я ляжаў на ложку і ціха збіраў перажыванні ўнутры. Злаваўся на сябе, людзей і ўвесь белы свет. Калі шчыра, я ўжо і не памятаю, як у адзін з дзён дабраўся да псіхдыспансера і папрасіў дапамогі.

### ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА СЯБЕ ЗБОКУ

— Адбылося тое, чаго я баяўся больш за ўсё. Мяне паклалі ў палату з кратамі на вокнах. Насамрэч яна прызначаная для «ваенкаматчыкаў» (тых, хто «косіць» ад арміі). Таму першыя хвіліны знаходжання там нагадалі твор Яраслава Гашака: вакол было шмат сімулянтаў. Адны рабілі выгляд, што ў іх энурэз, іншыя быццам хадзілі ў сне. Назіраць за гэтым было і смешна, і сумна.

Па словах Сашы, лячэнне ў стацыянары чымсьці падобнае на адпачынак у санаторыі. Адзіная розніца — ты прымаеш лекі і з табой працуюць урачы-псіхатэрапеўты.

— У астатнім адчуваеш сябе пенсіянерам у «Журавінцы». Кормяць па раскладзе, ёсць ціхая гадзіна. А пасля сняданку — электрафарэз і масаж, — з усмешкай кажа суразмоўнік. — Калі сур'ёзна, то сапраўды карыснай аказалася групавая тэрапія. Разам з іншымі пацыентамі пад кіраўніцтвам урача мы абмяркоўвалі свае праблемы ў гульнявой форме. Часта даводзілася прымяраць на сябе розныя ролі. Я змог стаць на месца маіх блізкіх і паглядзець на сябе збоку.

Абавязковая частка лячэння — медыкаментозная. Таблеткі падтрымліваюць сон, стымулююць выпрацоўку сератаніну, абуджаюць нейрамедыятары. Пад наглядам спецыялістаў і дзякуючы ўздзеянням прэпаратаў хлопцу ўдалося нармалізаваць свой унутраны стан.

— Як бы дзіўна ні прагучала, на лячэнні я пазнаёміўся з класнымі людзьмі. На тэрапіі побач са мной сядзелі інжынеры, рабочыя, пенсіянеры. Чалавек пяць студэнтаў. Была нават жанчына, у якой дзеці вучыліся ў Оксфардзе.

Маме пра сваю хваробу і яе пераадоленне Саша расказаў праз два месяцы пасля дыспансера. Бацька і цяпер пра гэта не ведае.

— У маім выпадку лячэння ў стацыянары можна было б пазбегнуць. Я не давяраў сваім блізкім і баяўся адкрыцца. Думаў, што мама з татам не зразумеюць мае праблемы. Не паверыць, што яны сапраўды ёсць. Дарма.

### ТРЫМАЙ ГАЛАВУ Ў РУКАХ

Адразу пасля лячэння ў Сашы з'явілася празмерная актыўнасць і ўпэўненасць. Ён з лёгкасцю мог загаварыць з незнаёмцамі на вуліцах, шмат чытаў, яму не сядзелася на месцы. Але праз некаторы час смеласць пачала знікаць.

— Дэпрэсіўнае расстройства немагчыма вылечыць адным махам. У стацыянары мяне пазбавілі ад бачных сімптомаў хваробы: дрэннага сну, трывогі і боязі. Папрацавалі з камунікатыўнымі навыкамі і паднялі самаацэнку. Разам з урачом мы выявілі асабістыя прычыны ўзнікнення расстройства. Але перамагчы іх я павінен сам.

Працэс вылячэння марудны і можа заняць некалькі гадоў. Саша і сёння працягвае прымаць лекі штодня. Галоўнае цяпер — пастаянна «трымаць галаву ў руках» і не даваць ёй ахутацца меланхоліяй ні на дзень.

— Я не адчуваю сябе поўнай нікчэмнасцю. Ведаю, што магу быць арыгінальным, маю неблагое пачуццё гумару і здольнасці ў вывучэнні замежных моў. У той жа момант разумею: хвароба паўплывала на маё маўленне. Тыдні маўчання не прайшлі бясследна. Падчас размоў мне бывае складана выказаць свае думкі. Спадзяюся, з часам усё прыйдзе ў норму.

Пасля выпуску з універсітэта хлопец даволі доўга шукаў работу. Расстройства ні пры чым. Нідзе не пазначана, што ён лячыўся ад дэпрэсіі ў псіхіятрычным дыспансеры. Таму патэнцыйныя работадаўцы пра «дэпрэсіўны багаж» кандыдата нічога не ведалі. Амаль паўгода Саша «дармаедзіў». Не мог знайсці месца, дзе яму было б цікава. У выніку бацькам надакучыла аплачваць жыллё і ежу дарослага сына, і яны паставілі ўльтыматум: хуценька ўладкоўваешся куды-небудзь ці мы вернем цябе ў родны горад.

**«Хвароба паўплывала на маё маўленне. Тыдні маўчання не прайшлі бясследна».**

— Я ўдзячны ім за гэты крок. Інакш працягваў бы ленавацца і выцягваць у іх грошы. Сорам! — шчыра прызнаецца хлопец. — Зараз працую ў сферы IT-маркетынгу. Даводзіцца шмат размаўляць і пісаць па-англійску. Дарэчы, вучыць мову ўсур'ёз я пачаў у адзін з перыядаў, калі дэпрэсія крыху адступіла. А ў вольны час паказваю замежным турыстам Мінск: практыкую англійскую і развіваю камунікатыўныя навыкі. Два месяцы таму і сам выбраўся ў невялікую вандроўку — наведаў знаёмых у Берліне. Не дарма кажуць, што падарожжа — найлепшая тэрапія ад хандры і апатыі.

**Ганна КУРАК.**

#### Кампетэнтна

**Наталля БЕРАЗОЎСКАЯ, намеснік галоўнага ўрача па памежнай псіхіятрыі псіхіятрычнага дыспансера Мінска:**

— Дэпрэсія — шырокае паняцце, якое аб'ядноўвае розныя формы псіхічных захворванняў. З хранічнымі да нас часцей звяртаюцца людзі ў сталым узросце. Моладзь больш схільная да так званых адаптацыйных расстройстваў. Па сутнасці, яны з'яўляюцца рэакцыяй на пэўныя змены ў жыцці і носяць часовы характар. Аднак гэта не азначае, што такая дэпрэсія пройдзе сама па сабе.

Калі вы заўважылі сімптомы дэпрэсіўнага расстройства ў блізкага чалавека, ні ў якім разе нельга папракаць яго, вінаваціць у нечым ці падбадзёрваць фразамі накшталт: «Збярыся!» Дайце магчымасць выказацца, стварыце максімальна давяральныя ўмовы, якія дапамогуць раскрыцца. Ваша задача — аказаць падтрымку і рэкамендаваць звярнуцца па кваліфікаваную дапамогу. Калі чалавек наадрэз адмаўляецца ісці да ўрача, трэба высветліць, чаму.

Існуе шмат міфаў наконт прэпаратаў і метадаў лячэння псіхічных расстройстваў. Людзі мяркуюць, што пры першым звароце да псіхіятра іх тут жа паставяць на ўлік, выпішуць «воўчы білет» і пачнуць даваць праз меру лекі, якія ператвараюць чалавека ў агародніну. Вядома, гэта не так. У наш час лячэнне адаптацыйных расстройстваў даступнае і эфектыўнае, скіраванае на індывідуальны падыход. Аднаму будзе дастаткова псіхалагічнага суправаджэння, другому дапамогуць медыкаменты, трэцяму лепш звярнуцца да амбулаторнага ці стацыянарнага лячэння. Жорсткіх рамак ці рэкамендацый тут няма.

SEX-БАЛЯСЫ

# ТАТАЎ СТЫЛЬ

**Чытачы, што кожны з вас узяў ад свайго бацькі? Упэўнены, будзе мноства варыянтаў адказаў — як станоўчых, так, магчыма, і не вельмі. Памятаеце, як жартаваў Сямён Слепакоў, калі яшчэ гуляў у КВЗ за зборную Пяцігорска? «Тата абяцаў схадзіць у заапарк? Тата схадзіў!» («— Тата, калі ты ўжо выкінеш гэтыя старыя санкі? — Гэта легендарныя санкі, дачка! Ранкам я цябе на іх у садок вазіў, а вечарам мяне на іх мамка з гаража забірала».) Я, напрыклад, узяў уменне секчы дровы і мыць посуд пры адсутнасці гарачай праточнай вады. («— Тата, а чаму мы ўвесь час ядзім бульбу «ў мундзірах», а нашы суседзі пастаянна смажаць шашлыкі? — А гэта, сынок, таму, што яны гультаі. Яны не хочуць яе саджаць, акучваць і збіраць каларадскіх жукоў».) Брат уменняў узяў яшчэ больш. Як жартую: дайце яму адмысловы станок і пакажыце, як рабіць аграньванне каштоўных камянёў, — ён гэта зробіць. Усіх, у каго ёсць такі станоўчы досвед, — віншую. Як спяваў Уладзімір Высоцкі: «Значыць, патрэбныя кнігі ты ў дзяцінстве чытаў!»**

Іншымі словамі, добра, калі побач быў чалавек, які здолеў цябе нечаму навучыць, перадаць нешта, штосьці ўкласці. («Хлопчык становіцца мужчынам, калі ў яго ўпершыню знікае другая шкарпэтка».) Ды і для любой дачкі ў дзяцінстве ён — яшчэ той аўтарытэт. («Дзяцінства ў дзяўчынкі заканчваецца тады, калі яе ўпершыню завуць не есці, а гатаваць».) Бацька ж дрэннага не параіць, праўда? (Усё з таго ж ранейшага рэпертуару Слепакова: «Папа знает, папа пОжил, стих на музыку полОжил».) Гэта я ўсё да чаго хілю?

Можа, чулі, што апошнім часам ва ўсім свеце набывае папулярнасць стыль у адзенні, які так і называецца — татаў стыль. Што ён з сябе ўяўляе? Калі коратка, гаворка пра «брыдкага» выгляду расцягнутыя світары, такія ж кашулі і красоўкі. («Існуе легенда, што рэчы пасля сваёй смерці трапляюць на лецішча».) Мода на «бацькоўскія» рэчы з'явілася пасля таго, як адзін модны дом выпусціў калекцыю з мешкаватымі блейзерамі і «варанымі» джынсамі. Гэта тое, што насілі некалі бацькі цяперашніх тынэйджараў. Фактычна ў якасці модных тэндэнцый спецыялісты адзначылі стыль 1990-х гадоў. І вось гэтыя рэчы чамусьці (ці не з падачы найперш маркетолагаў?) прыглянуліся сучаснаму пакаленню, хоць і час зараз іншы, і настальгіі па мінулым у яго быць не можа. («— Мне падабалася ў 90-я, я з задавальненнем бы туды вярнуўся. Можа, яшчэ і збудзецца, хто ведае. — Я вельмі выбачаюся, але вы з якога боку паяльніка былі?»)

Дарэчы, трэба асобна сказаць пра красоўкі. Шпількі, як канстатуюць спецыялісты ў гэтай галіне, імкліва выходзяць з моды. А «татавы шузы», якія дакладна капіруюць абутак усё тых жа 1990-х гадоў, такімі ж шпаркімі тэмпамі набіраюць папулярнасць. («Хачу, каб заўтра мама надзела на мяне футра і рукавічкі і павяла ў садок, а на работу я не хачу».) За 2017 год продажы туфляў на абцасах упалі ў ЗША на 11 працэнтаў, а за той жа год прыбытак ад рэалізацыі спартыўнага абутку дасягнуў 20 мільярдаў долараў. «Татавы красоўкі» ўжо стала модным насіць не толькі са спартыўным адзеннем, але і са... строгімі касцюмамі, і з сукенкамі. Ці маглі бацькі цяперашніх юнакоў і дзяўчат некалі нават уявіць такое? («У недалёкім будучым сядзяць дзед з унукам, размаўляюць: «Дзеда, а ты адкуль столькі ўсяго ведаеш?» — «Дык ты пагуглі з маё...») Тут галоўнае, каб на фоне ўсіх гэтых навамодных тэндэнцый абышлося без перагібаў, як яно часта бывае на Захадзе. («— У спартыўным абутку нельга. — Кеды з сукенкай — гэта трэнд, ведаць трэба! — Можа быць, але правілы ёсць правілы. Так што, мужчына, прабачце».)

А то вось вам гісторыя ў тэму — пра гарачых італьянскіх мужчын. Ну, сярод іх жа таксама могуць быць таты, так? («— Вы гарантуеце, што сродкі пойдуць менавіта дзецям? — Усе мы чые-небудзь дзеці...») У гэтай краіне кароткія штаны настолькі модныя і папулярныя, што нават надыход зімы не можа прымусіць моднікаў пераапрануцца ў нешта па сезоне. І ведаеце, што яны прыдумалі? Насіць маленькія шалікі на... кожнай шчыкалатцы. Далібог, гэта ж фэйк! Рынак такіх хустак (!) і шалікаў (!) у Італіі зараз, калі верыць сеціву, на ўздыме, дызайнеры прапануюць розныя мадэлі ў розных колерах. Ну, вось чаму такія таты могуць навучыць дзяцей? Хаця... («Пакаленне, якое зараджала ваду тэлевізарам, асуджае пакаленне, якое лавіла пакемонаў тэлефонам».)



Затое барадачы ў сацыяльных сетках проста пазабаўляліся, прыдумаўшы новы трэнд. Яны ж вясёлыя, чаму б не адарвацца! («Жывеш-жывеш сабе, а потым — бац! І шаснаццаць ужо не табе, а дзецям!») Барадачы сталі рабіць сэлфі з аптычным падманам: фатаграфуюць сваю расліннасць на твары, гледзячы ў столь. У залежнасці ад ракурсу вушы бачныя або не, шыя аказваецца на месцы твару, а барада выконвае ролю валасоў на галаве. Некаторыя нават малююць на шыі твары ці начэпліваць яшчэ і сонечныя акуляры. Карацей, гэта трэба бачыць *(гл. фота)*. («Да таго часу, калі ты зразумееш, што твае бацькі мелі рацыю, у цябе ўжо будзе сын, які будзе лічыць, што ты не маеш рацыі».)

...Калі ж сур'ёзна, у нас па ўсёй краіне пачалі адкрывацца «Тата-Залы» — месцы, дзе маладыя таты могуць бясплатна бавіць вольны час са сваімі дзецьмі, займацца фізкультурай. («— Тата, я больш ніколі не пайду з табой на санках катацца! — Маўчы, сынок! Вязі, давай!») Што можа быць лепш?! Татаў стыль — ён такі!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**



# «Мару пра шматмільённую аўдыторыю»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Як даведалася, што прайшла кастынг?***

— Насамрэч, каб патрапіць на тэлевізійны кастынг, трэба было спачатку прайсці перадкастынг. І вось пра тое, што прайшла яго, даведалася зусім нечакана. У пачатку верасня захварэла на бранхіт, і ў адну цудоўную раніцу ў пакой зайшла мама і паведаміла гэтую навіну. Шчыра, тады ў мяне ўзнікалі розныя эмоцыі: я і радавалася, і перажывала, што з-за хваробы доўга нічога не рэпеціравала. У выніку мы паехалі на кастынг, ён цягнуўся досыць доўга. Але ўсе гэтыя чаканні былі таго вартыя. Літаральна праз пару дзён нам патэлефанавалі і сказалі: «Вы прайшлі». Адчуванні былі тады такімі, што словамі не перадаць! Спачатку — шок, нічога не магла зразумець, потым была вельмі шчаслівая, ну а затым пачалася доўгая і карпатлівая падрыхтоўка да праекта.

***— Як ты лічыш, на «Голасе» трапіла да «свайго» настаўніка?***

— Спачатку думала, што буду ў Леаніда Агуціна. На жаль, калі да мяне дайшла чарга, у яго ўжо ўсе месцы ў камандзе былі занятыя. Але я не пашкадавала аб тым, што трапіла да Дзімы Білана. Ён цудоўны чалавек, адзін з самых шчырых настаўнікаў, з якімі ўдалося папрацаваць.

***— Калі параўнаць гэты праект і ўдзел у дзіцячым «Еўрабачанні», які з іх быў для цябе цяжэйшым?***

— «Голас» — самы першы праект і таму самы цяжкі. Хваляванне было каласальнае. А што датычыцца «Еўрабачання», у нацыянальным адборы эмоцый, вядома, прысутнічалі, але я не магу сказаць, што гэта было таксама, як на «Голасе». Магчыма, з прычыны меншай колькасці канкурсантаў. І, як той казаў, дома і сцены дапамагаюць! Калі гаварыць пра фінал «Еўрабачання», там я была больш-менш спакойная. Можа, таму, што ў мяне былі і тэмпература, і кашаль, і я больш засяроджвалася не на хваляванні, а на тым, каб не закашляцца *(смяецца)*. Калі ж зразумела, што нічога не адчуваю ў горле, ніякага пяршэння, стала самым упэўненым чалавекам!

***— У цябе шмат часу займае творчае жыццё. Ці хапае яго на школу?***

— Калі пачала прапускаць урокі з-за праектаў, настаўнікі пачалі гаварыць пра тое, што нехта нешта не давучыў... Паколькі я выдатніца, то гэтыя маленькія хібы былі досыць прыкметныя. Натуральна, мне такі вынік не падабаўся, таму пачала хутка выпраўляць гэту сітуацыю.

***— Ты вучышся ў 10 класе. Ужо абрала, куды будзеш паступаць?***

— Пакуль не задумвалася, куды мне ісці пасля 11 класа, хоць да заканчэння вучобы засталося менш як два гады. Але я дакладна ведаю, што ў далейшым хачу звязаць сваё жыццё з музыкай. Хачу дарыць слухачам найперш уласную. У мяне ёсць песні, якія напісала сама, але яны ляжаць у стале і мне здаецца, што я іх не хутка пакажу. Буду вельмі спадзявацца на тое, што мае мары некалі спраўдзяцца, што я нарэшце праспяваю свае кампазіцыі, выступаючы перад шматмільённай аўдыторыяй. Так, ведаю, што гэта мара, да якой прыйдзецца ісці доўга, упарта і праз слёзы, але я буду старацца.



***— Нядаўна ты была вядучай дзіцячага «Еўрабачання» ў Мінску...***

— Так, калі мне сказалі пра гэта, я не проста не паверыла, увогуле на хвіліну змоўкла, потым заплакала і праз слёзы спытала: «А хто са мной вядзе?» Я вельмі рада, што была адной з вядучых такога маштабнага конкурсу і працавала побач з такімі выдатнымі людзьмі, як Яўген Перлін і спявачка Зена.

***— Ці ёсць у цябе хобі, акрамя музыкі?***

— Я амаль увесь свой час аддаю ёй. Аднак у мяне ёсць і мноства іншых захапленняў. Вельмі люблю чытаць, часта знаёмлюся з біяграфіямі вядомых акцёраў або цікавых асабістаў для мяне асоб. У прынцыпе люблю глядзець серыялы, як і любы падлетак. У будучыні вельмі хачу навучыцца іграць на барабанах і гітары, таму я гэта з году ў год буду сабе паўтараць, пакуль не навучуся *(смяецца)*. Таксама апошнім часам мне вельмі падабаецца вывучаць мантаж, відэараскадроўку. Акрамя таго, што люблю працаваць з камерай, мне падабаецца перад ёй пазіраваць.

***— У цябе ёсць куміры, на якіх імкнешся быць падобнай?***

— Я стараюся быць ні на каго не падобнай. Ёсць людзі, якія проста мяне зачароўваюць, скажам, Майкл Джэксан. Я сказала б, што гэта мой музычны эталон, ён адкрываў для нас новую музыку, новае гучанне, гэта чалавек, які ўвесь час працаваў. З новых імёнаў гэта Sevdaliza, Cardi. Як бы гэта дзіўна ні гучала для некага, але мне вельмі падабаецца слухаць класіку, асабліва Бетховена і Баха. З рок-гуртоў — Nirvana, AC/DC. Як бачыце, я сапраўдны меламан *(смяецца)*.

***— Ці падабаецца, калі на конкурсах спяваюць твае песні?***

— Мінусоўкі маіх "Я самая" і «Stop», у прынцыпе, нельга знайсці ў інтэрнэце. Люблю, калі робяць каверы, і сама запісваю іх на кампазіцыі іншых выканаўцаў у сябе ў «Інстаграме». Што датычыцца менавіта выканання маёй песні, не ведаю чаму, але мне не падабаецца, калі яе выконваюць на нейкіх конкурсах. Калі б гэта было новае гучанне, а не дакладнае паўтарэнне майго выканання, то я толькі за!

***— Як ставішся да крытыкі?***

— Раней увогуле не заўважала. Цяпер рэагую толькі на канструктыўную, хоць у інтэрнэце мала такой. Пісалі рознае: што ў 15 выглядаю на 20, пра маю знешнасць, пра творчасць... Але я зразумела, што на гэта не варта звяртаць увагі. У падлеткавым узросце не выбіраюць, як выглядаць. І я гэта кажу не толькі пра сябе. Вельмі многія канкурсанты, якія былі на дзіцячым «Еўрабачанні», таксама чыталі падобныя каментарыі і ўспрымалі іх вельмі балюча. Ды і не толькі на гэтым конкурсе, на любым іншым праекце таксама такое ёсць. Таму я заўсёды шукаю ў людзях толькі станоўчыя якасці!

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка II курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 09.01.2019 г.

# «СІМВАЛ БЕЛАРУСІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы зразумелі, што пара зрабіць пераклад на сучасную беларускую мову. Бо пераклады, якія ўжо існавалі, не зусім адпавядалі сучаснасці і лексікай, і граматыкай. Мы ўсведамлялі, што ўсе пераклады павінны быць зроблены з арыгінала. У постсавецкі час складана было знайсці людзей, якія ведаюць і старажытнагрэчаскую мову, і сучасную беларускую мову. Да таго ж важна было прачытаць іншыя пераклады. Безумоўна, звярталіся да прац Скарыны, глядзелі, якую ён выкарыстоўваў лексіку. Мы працягваем яго традыцыю.

Чыста фізічна было цяжка зрабіць пераклад. Бо не ўсе тыя, хто мог займацца ім, у той час пражывалі ў Мінску. Я тады жыў і служыў у Слоніме. Натуральна, збірацца часта мы не маглі. Спачатку пачалі сустракацца раз на месяц. Да таго ж мы ўсе, хто ўвайшоў у групу, дзесьці працавалі. Іван Чарота, напрыклад, з загадчыкам кафедры ва ўніверсітэце быў, і загадваў секцыяй перакладаў у Саюзе пісьменнікаў, і ў ВАКу займаў пэўную пасаду. Пры такой занятасці кожнага было складана знайсці час, але ўсё ж такі пачалі збірацца раз на тыдзень па чацвяргах. Натуральна, калі на гэты дзень прыпадала свята, святарам трэба было быць на службе. Таму працэс ішоў доўга, але цярпліва, радок за радком мы перакладалі. Складаным было і тое, што царкоўная багаслоўская тэрміналогія не надта распрацавана. Часта доўга думалі, якое слова выбраць, як перадаць тое ці іншае паняцце.

***— Атрымліваецца, хтосьці з вас добра ведае старажытнагрэчаскую мову, хтосьці выдатна валодае сучаснай беларускай мовай, а хтосьці блізка знаёмы з іншымі перакладамі. Вы ў літаральным сэнсе перакладалі разам?..***

— Так, сустракаліся складаныя выразы — трэба было параўнаць, а як іх пераклалі на іншыя мовы. На англійскую, напрыклад, ёсць дзясяткі перакладаў, таксама на французскую шмат, на польскую мову некалькі. У нас у групе ёсць людзі, якія ведаюць некалькі замежных моў. Акрамя царкоўнаславянскага, мы глядзелі пераклады на рускую мову, іншыя пераклады на беларускую мову, і пераклады на іншыя мовы.

***— У адной са сваіх лекцый вы распавядалі, што на рускую мову ёсць толькі адзін пераклад Бібліі, а на беларускую іх зроблена шмат. Чым тлумачыцца такая сітуацыя?***

— Ужо існуе не адзін пераклад Бібліі на рускую мову. Агулам жа іх пераклады проста мала распаўсюджаны, не прызнаюцца аўтарытэтнымі. Акрамя афіцыйнага сінадальнага тэксту ёсць пераклад епіскапа Безабразава. Гэты пераклад час ад часу друкаваўся. Ён быў зроблены ў сярэдзіне XX стагоддзя і надрукаваны ў Парыжы эмігрантам. Нядаўна выйшаў поўны пераклад Бібліі на рускую мову, да якога можна ставіцца сур'ёзна. Астатнія пераклады прагледаліся дасведчанымі людзьмі, і ў іх бачыліся недакладнасці. І з-за шырокай вядомасці рускага перакладу, іншыя не надта заўважаліся. Растлумачу, чаму настолькі аўтарытэтны рускі сінадальны пераклад. Ён рабіўся прадстаўнікамі чатырох духоўных акадэмій рускай праваслаўнай царквы. Пасля канчатковы варыянт тэкстаў глядзелі ў Святым Сінодзе самыя высокія духоўныя асобы. І толькі пасля афіцыйнага зацвярджэння пераклад распаўсюджваўся. Яго аналізавалі спецыялісты па рускай мове з іншых краін і таксама прызналі дакладным.

Што датычыцца беларускіх перакладаў, яны рабіліся ў менш спрыяльных умовах. Скажам, пераклад пратэстанта Лукаша Дзекуця-Малея, які выйшаў у 1931 годзе, рабіўся ў межах тагачаснай Польшчы. А польскі ўрад вельмі адмоўна ставіўся да беларускай мовы і да беларускага нацыянальнага жыцця. У такіх умовах людзі спрабавалі нешта рабіць. Дзекуць-Малей не меў дастатковай адукацыі, перакладаў з рускай і з польскай моў. Нехта іншы пасля спрабаваў зрабіць яшчэ лепшы тэкст...

> **«Цяпер мы жывём у краіне, дзе зусім іншае стаўленне да царквы, да Бібліі. Яна прызнаецца самай важнай і галоўнай кнігай, прычым для ўсяго чалавецтва. Гэта радасна і прыемна».**

***— Якім быў ваш асабісты шлях да беларускай мовы?***

— Вельмі натуральным і арганічным. Мае бацькі і дзяды не размаўлялі ні на якой іншай мове, акрамя мовы нашай вёскі. І іншыя сваякі, дзядзькі таксама. Гэта мова была для мяне натуральнай. Але школа ў нашай вёсцы была на рускай мове. Беларуская мова з'явілася толькі з 3 класа. Мае бацькі, калі адпраўлялі мяне ў 1 клас, проста баяліся, што я не буду разумець. Некалькім сказам мама мяне загадзя навучыла: «У цябе будуць запытваць: «Как тебя зовут?» «Сколько тебе лет?» — Ты павінен адказаць». Памятаю такі выпадак. У нашых першых класах тады было па 40 чалавек. І нам задалі зрабіць практыкаванне. На сцяне віселі малюнкі ці стаялі каля дошкі. На іх былі намаляваны розныя прадметы — ці лыжка, ці відэлец, ці орган цела. Трэба было назваць гэта па-руску. Настаўніца запытвалася: «Што гэта?» Мы ўсе казалі «вока». Яна казала: «Няправільна. Хто ведае, як па-руску?» Ніхто з 42-х чалавек не ведаў.

Я ніяк не мог зразумець, чаму ў школе не могуць гаварыць на такой мове, на якой мы гаворым звычайна? І ніхто не мог мне адказаць на гэта пытанне, хоць я задаваў яго. Толькі мама сказала, што якая ўлада, такая і мова. Мама вучылася ў польскай школе. І калі хтосьці на перапынку размаўляў па-свойму, білі лінейкай па руках. Таму калі ў нашай школе нарэшце з'явілася беларуская мова і літаратура, я адчуў, што гэта сваё.

Больш-менш размаўляць па-руску я пачаў з чацвёртага класа. Да гэтага быў псіхалагічны бар'ер, я хоць і разумеў, але не адказваў. Напрыклад, некаторыя рускія словы, мне здаваліся, вельмі дзіўна гучаць, я чырванеў, калі вымушаны быў іх прамаўляць. Да таго ж думаў: як гэта гаварыць не на роднай мове, а на нейкай іншай?.. Па праўдзе да канца школы, па-за межамі ўрокаў, мы заўсёды размаўлялі на сваёй мове. Я назіраў, што толькі адслужыўшы ў войску, вяртаючыся, хлопцы пачыналі размаўляць па-руску. Мы ж у побыце карысталіся сваёй мовай.

Я люблю мовы, рускую мову люблю. Па-польску таксама выдатна чытаю, пішу і нават перакладаў афіцыйную сустрэчу. Але ў жыцці аддаю перавагу беларускай мове. Прамаўляю на ёй пропаведзі, размаўляю, калі ёсць з кім.

***— Ці бачыце запатрабаванасць перакладу Бібліі на беларускую мову?***

— Так, яна з'явілася адразу пасля таго, як пра пераклад стала больш-менш вядома. Першая прэзентацыя адбылася 2 верасня 2017 года падчас Дзён пісьменства ў Полацку. Тыя экзэмпляры, што мы прывезлі ў Полацк, за гадзіну раскупілі — што для некаторых было нечакана. Былі заказы і з усіх епархій. На месцах, у Брэсце, у Віцебску, паасобнікі разабралі адразу. Агульны наклад у 5000 хутка разышоўся. Пачалі прытрымліваць паасобнікі, каб было што падарыць пры неабходнасці. Здаецца, цяпер гэту кнігу можна набыць толькі ў Мінскім епархіяльным упраўленні, па адрасе Вызвалення, 10.

Нашым перакладам зацікавіліся і іншыя спецыялісты — міжнародная хрысціянская пратэстанцкая арганізацыя «Гедэонавы браты». Яны спецыялізуюцца на тым, што ва ўсіх краінах свету распаўсюджваюць Свяшчэнае Пісанне ў гасцініцах, у бальніцах, у іншых месцах. Яны пазнаёміліся з нашым перакладам, папрасілі правесці ў сябе яго багаслоўскую экспертызу — праверыць, наколькі дакладны. Зрабілі такі аналіз у ЗША, сабраўшы сваіх знаўцаў славянскіх моў, багасловаў. Выбралі 50 цытат з нашага перакладу, папрасілі як мага больш дакладна перакласці іх з беларускай на англійскую. І пасля гэтага вынеслі заключэнне, што пераклад дасканалы і якасны. Яны перавыдалі наш пераклад тыражом 30 000 і яшчэ 3 000 зрабілі для нас у падарунак. Гэтыя паасобнікі распаўсюджваюцца бясплатна. Людзі ахвотна біруць. Дай Бог, каб яшчэ і чыталі. На вокладцы змешчаны ефрасіннеўскі крыж — сімвал Беларусі. Думаю, гэта добрае спалучэнне — пераклад на беларускую мову і сімвал нашай краіны.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

---

Інавацыі ў адукацыі

# ПАТРАПІЛІ Ў ЛІК ШЧАСЛІЎЦАЎ

## Новае слова ў STEM-падыходзе

**У 2019 годзе дзякуючы Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні» ў беларускіх школах адкрыюцца яшчэ 10 STEM-цэнтраў — сучасных класаў, дзе дапытлівыя дзеці змогуць цалкам бясплатна навучацца па розных STEM-кірунках: адкрываць для сябе займальны свет праграмавання, робататэхнікі, навучацца 3D-мадэляванню і іншым навукам, без якіх хутка немагчыма будзе ўявіць сабе жыццё ў сучасным грамадстве.**



Шчасліўцамі сталі ўстановы адукацыі, якія перамаглі ў конкурсе «Хачу вучыцца ў STEM-класе», а менавіта сярэдняя школа № 12 у Светлагорску, школа № 3 у Вілейцы, школа № 1 у гарадскім пасёлку Шаркаўшчына, № 17 — у Оршы, № 1 — у Драгічыне, гімназія ў Дзяржынску, школа № 10 у Пінску, гімназія № 3 у Бабруйску, школа № 2 у Дуброўне і № 5 — у Салігорску. Усе яны атрымаюць фінансавую падтрымку для набыцця неабходнага абсталявання (камп'ютараў, набораў LEGO, 3D-прынтараў, праектараў і г. д.), а таксама для падрыхтоўкі педагогаў, якія будуць выкладаць у STEM-цэнтры.

— Хачу падзякаваць усім настаўнікам за іх творчасць, а таксама за задавальненне, якое мы атрымалі пры знаёмстве з конкурснымі матэрыяламі, — падкрэслівае **адзін з членаў журы Ірына АДАМОВІЧ, настаўнік матэматыкі з барысаўскай СШ № 20 і кіраўнік STEM-парка**, стваранага на базе гэтай установы таксама дзякуючы Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні». — Вельмі важна, што крытэрыі, па якіх ацэньваліся работы, далі магчымасць усёй настаўніцкай супольнасці лепш зразумець, вывучыць і паспрабаваць прымяніць на практыкы падыходы, якія адпавядаюць прынцыпам STEM-адукацыі. Да гэтага часу ў нашай краіне назіраўся пераважна «броўнаўскі», хаатычны, рух у гэтым кірунку.

Што мы разумеем сёння пад STEM-падыходам у адукацыі? Міжпрадметныя сувязі? Праектныя метады? Даследаванне? Камандную работу ці нешта яшчэ?

— І першае, і другое, і трэцяе, — падкрэслівае Ірына Адамовіч. — STEM-падыход — паняцце новае, яно яшчэ толькі фарміруецца, таму ў яго могуць уключацца розныя сэнсы, і ў розных краінах педагогі ўкладаюць сваё разуменне — найбольш ім блізкае.

Сярод школ, якія не ўвайшлі ў дзясятку, былі вызначаны лідары ў асобных намінацыях: «Найлепшы STEM-праект» — маладзечанская гімназія № 10, «Найлепшая каманда (настаўніцкая супольнасць)» — сярэдняя школа № 16 горада Оршы і «Найлепшы творчы ўрок» — гімназія горада Белаазёрска.

Установы адукацыі, што не перамаглі ў конкурсе, атрымалі дыпломы ўдзельніка і падарункавыя сертыфікаты на набыццё кніг, а таксама былі ўключаныя ў «рэзерв» на адкрыццё STEM-цэнтраў у будучыні. Конкурсныя матэрыялы пасля апрацоўкі будуць прадстаўлены Асацыяцыяй «Адукацыя для будучыні» ў адкрытым доступе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Акцыі

# Падлічым качак разам!

## Штогадовы «птушыны перапіс» вадаплаўных птушак праходзіць у студзені

**Як тлумачаць у грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ), зімовы ўлік праводзіцца для таго, каб ацаніць, колькі птушак і якіх відаў зімуюць у Беларусі, і спланаваць дзеянні па іх захаванні. З прычыны пацяплення клімату ў нас сустракаецца ўсё больш відаў на зімоўцы.**



Далучыцца да «птушынага перапісу» можна на працягу ўсяго студзеня: найлепш гэта рабіць у марозныя дні, бо птушкі будуць гуртавацца на адкрытых участках вадаёмаў. Усе як на далоні! Але самымі актыўнымі днямі акцыі будуць 18, 19 і 20 студзеня. «Нам важна, каб менавіта ў гэтыя дні да назірання далучылася як мага большая колькасць людзей, бо гэта значна павысіць дакладнасць вынікаў», — адзначылі ў АПБ.

Для ўдзелу ў акцыі трэба прыйсці да найбліжэйшага вадаёма, падлічыць, колькі птушак і якіх відаў там знаходзіцца. На сайце грамадскай арганізацыі **http://ptushki.org** размешчана памятка па ўліку птушак: як абраць месца і час для «перапісу».

Каб вызначыць від птушкі, можна карыстацца вызначальнікам на guide.florafauna.by. Калі і ён не дапаможа, варта сфатаграфаваць ці хоць бы апісаць птушак і падлічыць іх колькасць. Фота можна даслаць на info@ptushki.org або запампаваць на florafauna.by — спецыялісты дапамогуць вызначыць птушку. Для кожнага ўліку трэба запаўняць асобную анкету. Напрыклад, калі вы будзеце ў адзін дзень падлічваць птушак на рацэ і возеры, а праз некаторы час паўторыце ўлік на возеры, трэба будзе падаць тры анкеты. Паўторныя ўлікі на адным і тым жа вадаёме даюць карысныя звесткі. Іх варта праводзіць не часцей, чым раз на дэкаду.

Калі птушак на вадаёме няма ці ён увесь пакрыўся лёдам, таксама пазначайце гэта ў анкеце. Звяртайце ўвагу на акальцаваных птушак і пазначайце іх від, нумар кольца, дату і дакладнае месца назірання. Выдатна, калі зможаце зрабіць фота, дзе можна будзе прачытаць надпіс на кольцы.

Анкеты трэба дасылаць у Сакратарыят АПБ не пазней за 9 лютага 2019 года: у электронным выглядзе — на адрас: info@ptushki.org; у папяровым — на адрас: ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны», вул. Парніковая, д. 11, п. 4, 220114, г. Мінск.

Усе ўдзельнікі «птушынага перапісу» атрымаюць поўную інфармацыю пра яго вынікі. Улік водна-балотных птушак арганізуюць АПБ і Навукова-практычны цэнтр па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 25 января 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | <u>**Условие продажи:**</u> **1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя | | | |
| | **Местонахождение лотов №№ 1–4, 6–8:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | |
| **1** | Установка для приема товарного бетона УВР-7, № 936 | **4 097,40** | 204,87 | 409,74 |
| **2** | Фильтр ФЭСВ-1200 с вытяжным устройством R-7,3М, № 971 | **1 230,00** | 61,50 | 123,00 |
| **3** | Штукатурная станция СШВ-6 (передвижная), № 904 | **1 561,20** | 78,06 | 156,12 |
| **4** | Штукатурная станция ШС-4/6 №44/10083 | **1 648,20** | 82,41 | 164,82 |
| **6** | Вагон-бытовка 9000*3000, № 933 | **1 260,00** | 63,00 | 126,00 |
| **7** | Вагон-бытовка 6500*3000, № 931 | **1 434,60** | 71,73 | 143,46 |
| **8** | Малярная станция (вагон), № 176 | **1 626,00** | 81,30 | 162,60 |
| | **Местонахождение лотов №№ 9–11:** Гомельская область, Рогачевский р-н, н. п. Заречье | | | |
| **9** | Вагон-бытовка 6500*3000, № 44/10078 | **1 261,20** | 63,06 | 126,12 |
| **10** | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10080 | **1 815,60** | 90,78 | 181,56 |
| **11** | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10079 | **1 723,20** | 86,16 | 172,32 |
| **12** | Вагон-бытовка 9000*3000, № 44/10081. **Местонахождение:** Гомельская область, Рогачевский р-н, а. г. Тихиничи | **1 726,20** | 86,31 | 172,62 |
| **13** | **Капитальное строение с инв. № 322/17016**, общей площадью **7,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание насосной станции с резервуаром чистой воды (инв. № 96). Капитальное строение с инв. № 322/13307**, общей площадью **25,9 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное кирпичное здание склада кислородных баллонов (инв. № 95). Капитальное строение с инв. № 322/17013**, общей площадью **29,3 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание навеса для металлических баллонов (инв. № 10050). Капитальное строение с инв. № 322/С-17014**, общей площадью **12,4 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное металлическое здание склада для металлических баллонов (инв. № 10051). Капитальное строение с инв. № 322/С-17012**, общей площадью **133,2 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное дощатое здание (инв. № 10059). Капитальное строение с инв. № 322/С-13309**, общей площадью **460,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **двухэтажное кирпичное административное здание с подвалом (инв. № 91а). Местонахождение:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, д. 3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **324750100002000064,** общей площадью **1,8809 га (право постоянного пользования).** Целевое назначение земельного участка: для обслуживания производственной базы (СПМК-44). **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 13 опубликован в газете «Звязда» от 23.08.2018 г. № 161 (28777)** | **330 810,00** | 16 540,50 | 33 081,00 |
| | **Местонахождение лотов № 14-16:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кожедуба, 3 | | | |
| **14** | Станок токарно-винторезный, № 44/66 | **2 220,00** | 111,00 | 222,00 |
| **15** | Станок трубонарезной ВМС-2А с резьбонарезной головкой и комплектом головок, № 44/40217 | **1 380,00** | 69,00 | 138,00 |
| **16** | Консольный кран КК 0,5 тн, № 44/70 | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| | **Местонахождение лотов №№ 17–20:** Гомельская область, Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, д. 28 | | | |
| **17** | Станок токарно-винторезный 16ГС30-01, инв. № 44/44а | **4 015,80** | 200,79 | 401,58 |
| **18** | Форма для пустотных плит ПК-72-15, инв. № 44/325 | **2 299,80** | 114,99 | 229,98 |
| **19** | Емкость металлическая (горизонтальная), 15 куб. м, инв. № 44/61922 | **2 312,40** | 115,62 | 231,24 |
| **20** | Емкость металлическая (горизонтальная), 25 куб. м, инв. № 44/61926 | **1 822,80** | 91,14 | 182,28 |
| | **Местонахождение лотов №№ 21, 23–25, 27, 34, 36, 38,4 0, 43–49, 51-53, 55–63:** Гомельская область, Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Ленинградская, 7 | | | |
| **21** | Автобетоносмеситель КАМАЗ 53229 К, рег. № АК 5298-3, г. в. – 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель. Автокран ЗИЛ-133- ГУА, рег. № 8334ГСН, г. в. – 1988, цвет – голубой, тип ТС – грузовой специальный автокран | **8 700,00** | 435,00 | 870,00 |
| **23** | Автомобиль ГАЗ-САЗ – 3507, рег. № 8545 ГСН, г. в. – 1989, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **1 800,00** | 90,00 | 180,00 |
| **24** | Автомобиль ЗИЛ-ММЗ- 4502, рег. № ЕА 5611, г. в. – 1991, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал | **1 620,00** | 81,00 | 162,00 |
| **25** | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АВ 6370-3, г. в. – 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **5 280,00** | 264,00 | 528,00 |
| **27** | Автомобиль МАЗ 5432 А5, рег. № АК 3524-3, г. в. – 2008, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **4 980,00** | 249,00 | 498,00 |
| **28** | Автомобиль МАЗ 6422 А5, рег. № АК 3525-3, г. в. – 2009, цвет – желтый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **8 760,00** | 438,00 | 876,00 |
| **29** | Автомобиль МАЗ 642205, рег. № АЕ 7469-3, г. в. – 2010, цвет – белый, тип ТС – грузовой седельный тягач | **8 760,00** | 438,00 | 876,00 |
| **30** | Экскаватор пневмоколесный ЕК-14, рег. № ЕА-3 7306, г. в. – 2006, марка двигателя – Д-245 | **10 140,00** | 507,00 | 1 014,00 |
| **31** | Экскаватор пневмоколесный ЕК-1200, рег. № ЕА-3 9115, г. в. – 2007, марка двигателя – Д-243с | **7 740,00** | 387,00 | 774,00 |
| **32** | Автобетоносмеситель МАЗ 6303А3 СМБ-372-30, рег. № АЕ 0215-3, г. в. – 2009, цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный автобетоносмеситель | **22 560,00** | 1 128,00 | 2 256,00 |
| **33** | Автобус МАЗ 256270, рег. № АЕ 7317-3, г. в. – 2010, цвет – бордовый, тип ТС – автобус-вагон | **19 740,00** | 987,00 | 1 974,00 |
| **34** | Автобус МАЗ 256270, рег. № АВ 1882-3, г. в. – 2007, цвет – белый, тип ТС – автобус-вагон | **11 940,00** | 597,00 | 1 194,00 |
| **36** | Узел бетонный самозагружающийся FIORI DB350S, рег. № ЕВ-3 0370, г. в. – 2008 | **49 020,00** | 2 451,00 | 4 902,00 |
| **38** | Экскаватор пневмоколесный гидравлический EW-1400, рег. № ЕВ-3 4134, г. в. – 2011, марка двигателя – Д-245 | **46 620,00** | 2 331,00 | 4 662,00 |
| **40** | Экскаватор-погрузчик Амкадор 702ЕМ-03 на базе трактора «Беларус» 92П, рег. № ЕВ-3 5785, г. в. – 2000, марка двигателя – Д-245 | **15 180,00** | 759,00 | 1 518,00 |
| **43** | Автомобиль ГАЗ 5201, рег. № 7134 ГСП, г. в. – не определен, цвет – голубой, тип ТС – грузовой бортовой | **1 560,00** | 78,00 | 156,00 |
| **44** | Автомобиль МАЗ 555102 2125, рег. № EI 0329, г. в. – 2005, цвет – оранжевый, тип ТС – грузовой самосвал | **4 680,00** | 234,00 | 468,00 |
| **45** | Автомобиль ГАЗ 32213, рег. № АВ 4799-3, г. в. – 2008, цвет – темно-сине-зеленый, тип ТС – автобус-вагон | **2 100,00** | 105,00 | 210,00 |
